Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАУЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАУ БССР І УПРАУЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАУ ПРЫ СНК БССР

№ 32 (446) | Аўторак, 12 верасня 1939 года | Цана 20 кап.

АБ ЛІТАРАТУРНАЙ СПАДЧЫНЕ

Владзімір Ільіч Ленін у сваім выступленні на III з'ездзе Расійскага Комуністычнага Саюза Моладзі гаварыў:

«Толькі дакладным веданнем культуры, створанай усім развіццём чалавецтва, толькі перапрацоўкай яе можна будаваць пролетарскую культуру—без такога разумення нам гэтай задачы не вырашыць». І яшчэ: «Пролетарская культура павінна з'явіцца закономерным развіццём тых запасаў ведаў, якія чалавецтва выпрацавала пад гнётам капіталістычнага грамадства, памешчыцкага грамадства, чыноўніцкага грамадства».

Гэтыя выключныя па філасофскай глыбіні думкі сталі праграмай у справе развіцця соцыялістычнай культуры. Кіруючыся ленінскімі ўказаннямі, у нашай краіне праведзена велізарная работа па збіранню і вывучэнню літаратурнай спадчыны, як рускай, так і іншых народаў СССР. З вялікай беражлівасцю сабраны і збіраюцца матэрыялы, звязаныя з жыццём і літаратурнай дзейнасцю Пушкіна, Гогаля, Талстога, Шаўчэнка, Горкага, Маякоўскага і інш.

Нямала зроблена ў гэтай галіне і ў Беларусі, тым не менш далёка не ўся літаратурная спадчына беларускіх пісьменнікаў сабрана.

Ворагі народа шмат нашкодзілі на гэтым фронце. Некаторыя з іх намагаліся давесці, што беларуская літаратура зусім не існавала, а значыць аб літаратурнай спадчыне не павінна быць і гутаркі. Гэта наглая хлусня разбіта. Але збіраннем і вывучэннем літаратурнай спадчыны ў нас займаюцца яшчэ злачынна мала. Шмат яшчэ тут раўнадушша, абыякавасці. Калі што і зроблена, то зусім выпадкова, бессістэмна. У нас да гэтага часу няма ніякага зборніка старажытнай беларускай літаратуры, няма хрэстаматыі па літаратуры XIX стагоддзя, не выдадзены такія папулярныя ў народзе творы, як «Тарас на Парнасе». Наш чытач не мае поўнай магчымасці азнаёміцца з творамі Марцынкевіча, Багушэвіча, Багдановіча, Цёткі толькі таму, што іх няма дзе дастаць. Між тым творы гэтых пісьменнікаў уведзены ў праграму сярэдніх школ. Каб іх знайсці, настаўнікам прыходзіцца адкапваць струхлелыя выданні, сфабрыкаваныя ворагамі народа. Вельмі часта і зусім не знаходзяць патрэбных твораў.

Якія задачы ў гэтай справе стаяць перад Акадэміяй Навук БССР, Саюзам совецкіх пісьменнікаў БССР, выдавецтвам і ўсёй нашай літаратурнай грамадскасцю?

Трэба сабраць старажытныя помнікі беларускай літаратуры. Чаму-б не паслаць навуковыя экспедыцыі ў Маскву, Ленінград і Кіеў? У архівах і музеях гэтых гарадоў, па звестках, маюцца малавядомыя арыгінальныя творы старажытнай беларускай літаратуры. Гэтыя матэрыялы патрабуюць глыбокага вывучэння, ацэнкі і выдання.

Па літаратуры XIX стагоддзя неабходна сабраць, вывучыць і выдаць зборы твораў Вінцэнта Дуніна-Марцынкевіча, Багушэвіча, Цёткі і Багдановіча. Акрамя поўных збораў трэба выдаць і выбраныя творы гэтых пісьменнікаў і асобныя творы (напрыклад: «Пінскую шляхту» Марцынкевіча). Выданне і папулярызацыя твораў гэтых пісьменнікаў—справа вялікага культурнага значэння. Таксама патрэбна пераглядзець, вывучыць і выдаць творы пісьменнікаў XIX стагоддзя: Яна Чачота, Баршчэўскага, Рыпінскага, Паўлюка Бахрыма і пісьменнікаў XX стагоддзя: Янкі Лучыны і Ядвігіна Ш.

Асобна трэба сказаць пра спадчыну совецкіх пісьменнікаў: Паўлюка Труса, Эдуарда Самуйлёнка і Алеся Гурло.

Акадэмія навук выдала збор твораў Паўлюка Труса, але гэтае выданне нас далёка не здавальняе. Творчасць Паўлюка Труса ў гэтым выданні прадстаўлена не поўнасцю, шмат неапублікаваных твораў паэта знаходзіцца ў прыватных асоб. Ні Акадэмія Навук, ні саюз пісьменнікаў нічога не зрабілі, каб гэтыя творы сталі здабыткам шырокіх мас працоўных. Ёсць неабходнасць выдаць зборнік выбранай паэзіі Паўлюка Труса, адабраўшы для яго самае лепшае, напісанае паэтам.

Больш поўгода прайшло з дня цяжкай утраты пісьменніка-ордэнаносца Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка. Творы пісьменніка карыстаюцца вялікай любоўю ў нашага чытача. Між тым, камісія, вылучаная Праўленнем ССПБ, да гэтага часу не прыняла спадчыну Эд. Самуйлёнка. Гэта маруднасць — недаравальная. Патрэбна неадкладна распачаць падрыхтоўку выдання поўнага збору твораў Эдуарда Самуйлёнка.

Не сабрана і не ацэнена творчасць аднаго з старэйшых беларускіх совецкіх пісьменнікаў Алеся Гурло, а творчасць гэтага паэта заслугоўвае значна большай увагі, чым яму дагэтуль удзялялася.

Мы думаем, што трэба арганізаваць збор не толькі літаратурных твораў, але і матэрыялаў (дакументаў, фатаграфій, рэчаў), звязаных з жыццём і дзейнасцю беларускіх пісьменнікаў.

Пакуль жывуць сучаснікі Багдановіча, Цёткі і іншых дарэволюцыйных пісьменнікаў, трэба запісаць іх успаміны.

Думаем, што наспела пытанне і аб арганізацыі Мінскага літаратурнага музея, які стаў бы скарбніцай каштоўнасцей беларускай літаратуры.

Да 1000-годдзя армянскага народнага эпаса

„ДАВІД САСУНСКІ"

У верасні гэтага года армянскі народ святкуе тысячагоддзе стварэння свайго велічнага нацыянальнага эпаса, вядомага пад назвай «Давід Сасунскі».

Эпас складаецца з чатырох частак. У першай з іх расказваецца аб подзвігах старэйшых багатыроў Санасара і Багдасара. Абодва героі ўвасабляюць у сабе творчую магутнасць армянскіх працоўных мас. Санасар і Багдасар пабудавалі непрыступную крэпасць Сасун.

Камни безмерные, беспримерные волокли,
И с мастером вместе работы вели.

Мышцы их мощные все непосильное
превозмогли.
На каменный столб каменный столб
взнесли,
Перемычки свели, до конца довели
крепость свою.

Санасар і Багдасар вызвалілі армянскі народ ад уладарства магутнага арабскага халіфа. Яны не бралі з насельніцтва ні падаткаў, ні налогаў, яны былі абаронцамі і апорай беднякоў.

У другой частцы народнай эпічнай паэмы армян расказваецца аб жыцці і подзвігах сына Санасара — Мгера старэйшага. Мгер ачысціў армянскую зямлю ад пачвараў. Ён разадраў напалам драпежнага льва, схапіўшы яго за сківіцы голымі рукамі. Ён адбіў новыя спробы арабаў падпарадкаваць сабе горды і свабодны Сасун.

Мгер быў бацькам Давіда, галоўнага з ліку сасунскіх храбрацоў. Па імю Давіда атрымала сваю назву ўся паэма.

Мгер памёр, калі Давід быў яшчэ дзіцянём. Арабы выкарысталі малалецтва Давіда і зноў напалі на армянскую зямлю.

Як толькі даведаўся Мелік (арабскі цар), што памёр Сасунскі Мгер, —

Он писал приказ,
По Мсыру разослал, войска собрал,
Чтоб на Сасун итти войной.
Арабы нагрянули в землю Сасун...
Опустошил Мелик страну,
Все подати за много лет собрал,
Угнал во Мсыр стада,
И землю разорил,
И покорил народ.

Давід ужо з маленства праявіў багатырскую сілу. Як толькі ён вырас, ён стаў на абарону радзімы. Ён прагнаў пасланца Меліка, які прыйшоў за данінай. Ён надзеў на сябе велізарную шапку, апаясаўся мячом-маланкай, сеў на вешчага і магутнага каня Джалалі.

Давид-
Грянул молнией-мечом.
Меч расколол все сорок жерновов, *)
Рассек все сорок шкур.
Чудовище Мелика разрубил
Рассек от лба да ног.
На три сажени в землю врос
Дошел до черных вод...
Из ямы крикнул Мерамелик
«Еще я жив, Давид!
Руби еще».
Давид ответил: «Мерамелик, а ну
встряхнись!»
Встряхнулся в яме Мерамелик,
И развалился пополам, —
Иссякла жизнь его.

Давід канчаткова вызваліў армянскі народ ад арабскага іга.

Гістарычныя асновы цыкла сказанняў аб сасунскіх багатырах і складаюць падзеі з эпохі барацьбы армян за вызваленне ад арабскага ўладарства.

Арабы ўступілі ў Арменію ў VII стагоддзі нашай эры. Разбітая на феадальныя варожыя княжствы, Арменія не магла адстаяць сваю дзяржаўную самастойнасць.

Ужо ў канцы VII стагоддзя народныя масы Арменіі адказваюць на ўціскі арабаў паўстаннямі. Двухсотгадовая ваенная ўлада арабаў у Арменіі ўвесь час парушалася паўстаннямі, у якіх армянскі народ паказаў выдатную мужнасць і ўпартасць. У гэтай барацьбе асабліва вылучылася акруга Сасун, якая добра была абаронена трудна-праходнымі гарамі.

Народныя масы склалі вакол эпізодаў барацьбы Сасуна рад паэтычных сказанняў, увасобіўшых іх імкненне да нацыянальнай незалежнасці. Так склаўся былінны эпас «Давід Сасунскі».

«Давід Сасунскі» дагэтуль сказваецца ў вёсках і гарадах совецкай Арменіі. Выключная папулярнасць эпаса тлумачыцца зусім акрэсленымі прычынамі: тэма барацьбы за нацыянальную незалежнасць мела для армянскага народа значэнне непасрэднай актуальнасці на працягу многіх стагоддзяў аж да ўстанаўлення совецкай улады, канчаткова сцвярдзіўшай свабоду армянскага народа.

Выдатна, што пачуццё нацыянальнага дастоінства і нацыянальнай мужнасці ў эпасе нідзе не пераходзіць у нацыянальную выключнасць, у нацыянальную нецярпімасць. Віну за кроў, грабежніцтва і гвалты армянскі народ не перакладаў з пануючых класаў на працоўных. Прычыну войнаў нацыянальны армянскі эпас бачыць не ў інтарэсах народаў, а ў захватніцкай палітыцы цароў і кіраўнікоў. Вельмі характэрны у гэтых адносінах эпізод са старыком-арабам, якога разам з яго сынамі Мелік прыгнаў гвалтам на вайну. Давід спусташальнай, смертаноснай бурай пранасіўся па стану арабаў. Старык без зброі, з непакрытай галавой выбег з гушчара войск і звярнуўся да сасунскага героя:

«Давид мой дорогой,
Ведь это люди, существа живые!..
Все они—обездоленный бедный люд.
Это войско несчастное ты пожалей:
Тот—опора матери старой своей,
Тот—женился недавно и пригнан
сюда,
Тот—оплот и надежда бедной семьи,
Тот—родитель престарелых звезда».

«Навошта-ж ваяваць яны са мной прышлі?»—пытаецца Давід. Старык адказвае яму:

«Что-ж было делать нам?
Мелик насильно нас привел.
Мы не враги тебе! Твой враг—Мелик
Иди и с ним воюй!»

У сэрцы Давіда жыло разуменне пачуццяў простых людзей, веданне іх становішча, іх інтарэсаў. Ён вырашыў скончыць вайну адзінаборствам з Мелікам.

Перамогшы Меліка, Давід зварочваецца да яго войска з наступнымі словамі:

«Вам всем дарую волю я!
Идите все туда, откуда вы пришли.
Идите по домам, живите, как вы
жили
И дани с вас не нужно мне...
Сидите дома у себя спокойно.
Не вздумайте ходить войною на
Сасун».

Давід змагаўся толькі за незалежнасць роднага народа. Ён не хацеў выкарыстаць сваю перамогу для парабашчэння чужых краін. Ён разумеў, што моцны мір магло даць толькі роўнапраўе, толькі мірнае садружаства народаў.

Чацвертая частка эпаса прысвечана Мгеру, малодшаму сыну Давіда. Мгер вандруе па свеце ў пошуках праўды. Свет змяніўся, у ім накапілася шмат зла, гэтае зло напаўняе горычччу сэрца апошняга сасунскага багатыра. Людзі змяльчэлі, пастарэла зямля, яна больш не можа насіць асілкаў. Мгер рассек скалу багатырскай булавой, ён увайшоў разам з канём у пралом, скала замкнулася за ім.

Аднаму пастуху ўдалося трапіць у скалу, дзе Мгер сядзеў і чакаў лепшых дзён. Ён запытаўся ў яго:

«Калі з пячэры выйдзеш, Мгер?»

Мгер адказаў:

«Когда разрушится мир—и воздвигнется вновь,
Когда станет шиповниковой ягодой—
ячмень,
Тогда придет мой день,
Отсюда выйду я в тот день!»

Тры пакаленні багатыроў будавалі гарады, знішчалі пачвараў, праганялі іншакраінных заваявальнікаў, абаранялі правы і справядлівасць,—і апошні багатыр, не перамогшы зла, засеў у скалу чакаць лепшых дзён. Пакаленне за пакаленнем народ тварыў вялікія справы—яго працай, яго рукамі стваралася культура, ён сваёй кроўю адстойваў свабоду краіны, але не было яму шчасця, не было справядлівасці. Але народ не траціў надзеі, не траціў веры—час мяняецца. Свет будзе перабудаван нанава, надыйдзе зноў век багатыроў, народныя подзвігі прынясуць багацце і шчасце самому народу.

**
*

Вучэнне Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна, Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя, ленінска-сталінская нацыянальная палітыка прынеслі ажыццяўленне векавых надзей армянскага народа, выражаных у яго нацыянальным эпасе. Совецкая Арменія—роўнапраўны член вялікага брацкага саюза народаў, адна з адзінаццаці саюзных рэспублік, утвараючых СССР. Армянскі народ вызваліўся не толькі ад іншакраіннага прыгнёту, але і ад сваіх унутраных эксплаататараў. Шчаслівая совецкая Арменія, пабудаваўшая сваё жыццё на новых соцыялістычных пачатках, упэўненымі крокамі ідзе разам з іншымі народамі Саюза да комунізма.

В. КІРПОЦІН.

ЕРЭВАН.


*) Мелік схаваўся ад Давіда ў глыбокай яме, прыкрываючыся сарака жарнавамі і сарака валовімі скурамі.

В. МАЯКОЎСКІ

МУСКУЛ СВОЙ, ДЫХАННЕ І ЦЕЛА ДЛЯ ВАЕННАЙ СПРАВЫ ТРЭНІРУЙ УМЕЛА

Бясспрэчна гэта:
спорт
кожнаму
патрэбен летам.
Але які?
Марна тузаць
рукамі ў бакі?
Не,
не мэта!
З карысцю правядзі
бягучае
лета.
Сарочку
ў чатыры паты прамачы,
гол
заганяй
і нагой, і ілбом,
каб кідаць
у будучым
разрыўныя мячы
ў адказ
на град
белагвардзейскіх бомб.
Мускулы
марна
не нам нагандаць,
не нам
вырошчваць
«мужчын у саку».
З налёту
вучыся
скакаць на каня,
вучыся
з пляча
сячы на-скаку.
Дача.
Комсамолкі.
Сорак па Цэльсію.
Страляюць
вочкамі
вусатых прапыр.
Комсамолка,
лепей
з нагана цэлься.
І думай:
прад табою
лорды і папы.
Жыр
нарастае —
важкі, шырокі —
на пышных
канцылярскіх жыватках.
Служачы,
годзе.
Часовы жырок
скідай з сябе
ў стралковых гуртках.
Знай
і французскі,
і англійскі бокс,
ды не з тым
каб сківіцы
скручваць на бок,
а каб,
не збаяўшыся
ні штыкоў, ні куль,
адзін
абяззброіць мог
цэлы патруль.
Калі-ж
уважаеш веласіпед —
таксама
няма чаго
марна санець.
Помні,
на колах
ты лепш, чым пеша,
даставіш у штаб
баявыя дэпешы.
Развівай
дыханне,
мускулы,
цела
не затым,
каб марна
нарошчваць біцэпс,
а каб
абаронная справа
мацнела,
каб лепей
з ворагам біцца.

Пераклад Р. ЛЫНЬКОВА.



Скульптурная група каля ўвахода ў павільён Таджыкскай ССР.

САЮЗУ СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ АРМЕНІІ

Саюз совецкіх пісьменнікаў Беларусі вітае рабочых, калгаснікаў, літаратараў і ўсю інтэлігенцыю брацкай Арменіі з вялікім святам армянскай культуры — 1000-годдзем бяссмертнага народнага эпаса «Давід Сасунскі».

Армянскі эпас «Давід Сасунскі» даўно зрабіўся здабыткам усіх народаў Совецкага Саюза і ўвайшоў у іх культуру, як непаўторны ўзор народнай мудрасці, храбрасці, адданасці радзіме і нянавісці да яе ворагаў. Пачуцці, якія з такой сілай, праўдзівасцю і мастацкім майстэрствам апяваюцца ў «Давідзе Сасунскім» блізкі і зразумелы ўсім народам нашай радзімы.

Няхай жыве і працвітае армянскі народ і яго культура!

Няхай жыве дружба народаў СССР!

Няхай жыве наш родны і любімы правадыр, бацька і прыяцель вялікі Сталін!

ПРАЎЛЕННЕ ССП БССР
П. БРОЎКА, М. ЛЫНЬКОЎ, І. ГУРСКІ.

БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ ВЫЕХАЛІ У ЕРЭВАН

7 верасня група пісьменнікаў БССР — народны паэт ордэнаносец Янка Купала, Аксельрод і Якімовіч—выехала ў сталіцу Армянскай ССР Ераван для ўдзелу ў святкаванні тысячагоддзя народнага армянскага эпаса «Давід Сасунскі».



Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР скульптар **З. Азгур** закончыў працу над бюстам **Серго Орджанікідзе**. На здымку: тав. **Азгур** за аддзелкай скульптуры.

ПРЭМІРАВАННЕ РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВАЎ

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР адзначыла ў спецыяльным загадзе вялікую творчую работу калектыва Тэатра оперы і балета над пастаноўкай новай беларускай оперы «Дрыгва». Упраўленне абвясціла падзяку і ўзнагародзіла каштоўнымі падарункамі аўтара оперы тав. Багатырова, пастаноўшчыка Шлепянава, салістаў тэатра Друкер, Лапіна, Цярэнцева, Засецкага, Мурамцава, Дзянісава, Арсенка, артыстку хора Лазараву і іншых. Абвешчана падзяка дырыжору спектакля Грубіну, мастаку Нікалаевічу, хормайстру Кананенка, лібрэтысту Рамановічу, галоўнаму канцэртмайстру Жазмеру, салістам Крысці, Балошіну, Таланкіну, Аксёнавай, салістам хора Кроз, Шчэпініну, Каліноўскаму, Аўдзеенка, Сімаго і інш.

**
*

За добрую падрыхтоўку і правядзенне выступлення Заслаўскага калгаснага тэатра ў Маскве на Усесаюзным фестывалі калгасных тэатраў 28 жніўня бягучага года Упраўленне па справах мастацтваў абвясціла падзяку пастаноўшчыкам п'есы «Партызаны» К. Крапівы т.т. Данілаву і Палічынецкаму, дырэктару тэатра Шыфу, мастакам Ушакову і Багданаву, кампазітару Сакалоўскаму, харэографу Дароніну і ўсяму калектыву тэатра. Рад акцёраў: т. т. Ефрэмаў, Кір'янаў, Шыкавец, Кунцэвіч, Ефрэменка, Гвадзёў, Ячко, Яворскі прэміраваны.

АСЕННЕ-ЗІМОВЫ СЕЗОН ФІЛАРМОНІІ

1 кастрычніка Беларуская дзяржаўная філармонія адкрывае асенне-зімовы сезон 1939-40 года. Філармонія запрасіла на гастролі лаўрэатаў усесаюзных і міжнародных конкурсаў скрыпачоў і піяністаў: Гілельса, Аборына, Ойстраха, Серабракова, Міхноўскага, Цоміка, Власава і Амітона. Побач з маладымі майстрамі запрошаны таксама прафесары маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі піяніст Ігумноў і скрыпач Налякін.

Акрамя асноўных дырыжораў сімфанічнага аркестра — прафесара Мусіна і Сімсонава, для ўдзелу ў канцэртах запрошаны лаўрэаты усесаюзнага конкурса дырыжораў Мравінскі, Рахлін і Паверман, галоўны дырыжор тэатра оперы і балета БССР ордэнаносец Грубін, дырыжор Шнейдэрман. У рэпертуары сімфанічнага аркестра Філармоніі рад новых твораў совецкіх кампазітараў. У часе дэкады совецкай музыкі у лістападзе бягучага года аркестр выконвае «На полі Куліковым» Шапорына, канцэрт для скрыпкі з аркестрам украінскага кампазітара Глушкова, «Сказ аб Мядзведзіхе» беларускага кампазітара Багатырова. З класічнай спадчыны будзе выканана «Поры года» Гайдна, «Іуда Макавей» Гендэля, Рэквіем—Вердзі. Для апошніх двух твораў запрошан хор Ленінградскай дзяржаўнай акадэмічнай капэлы пад кіраваннем засл. арт. Свешнікава.

Вакальнае мастацтва ў сезоне будзе прадстаўлена народнымі і заслужанымі артыстамі, салістамі Маскоўскага ордэна Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра Саюза ССР, Ленінградскага ордэна Леніна тэатра оперы і балета імя Кірава, Кіеўскага дзяржаўнага ордэна Леніна тэатра оперы і балета і салістамі Вялікага тэатра оперы і балета БССР. У канцэртах выступяць ордэнаносцы Дзяржынская, Обухова, Рэйзен, Давыдава, Праабражэнская, Літвіненка—Вольгемут, Патаржынскі, Гайдай, народная артыстка БССР Александроўская, засл. арт. БССР Млодэк, Аляксеева, Балошін, Дзянісаў, Мурамцаў і інш.

Запрошан лепшы ў Саюзе ансамбль народнага танца Саюза ССР пад мастацкім кіраўніцтвам ордэнаносца І. Майсеева. Гастролі ансамбля пачнуцца 17 верасня.

Мастацкія калектывы Філармоніі БССР—хор, ансамбль беларускай песні і пляскі, аркестр беларускіх народных інструментаў выканаюць новыя творы совецкіх кампазітараў, класічныя творы і рад народных песень і танцаў народаў СССР. На працягу сезона адбудзецца рад літаратурных вечароў і канцэртаў на прадпрыемствах і навучальных установах, лекцыі, гутаркі і кансультацыі.

НАПЯРЭДАДНІ СЕЗОНА

Дзяржаўны Рускі Драматычны тэатр БССР існуе ўжо некалькі год. Грамадскасць рэспублікі ў праве была чакаць ад яго высокамастацкіх поўнакаштоўных спектакляў, упаўне задавальняючых запатрабаванні культурна ўзрослага совецкага гледача. Але тэатр не апраўдаў гэтых надзей. Бесперапынныя арганізацыйныя непаладкі, адсутнасць адзінай творчай мэтаімкнёнасці ў творчых работнікаў тэатра, цякучасць у акцёрскім і рэжысёрскім складзе, атмасфера ўзаемнага недавер'я і непрыязныя адносіны некаторых кіруючых работнікаў да маладняка—спрыялі няўдачам тэатра і цэламу раду ідэалагічных памылак. У мінулым сезоне вялікая частка спектакляў тэатра мела надзвычай нізкі ідэйна-мастацкі ўзровень і халодна была прынята гледачом.

Усё гэта паслужыла прычынай для карэннай рэарганізацыі тэатра. Калектыў яго ў бягучым годзе амаль поўнасцю абноўлен. У яго ўлілося 28 выпускнікоў Ленінградскага тэатральнага інстытута. Галоўным рэжысёрам тэатра прызначан заслужаны артыст рэспублікі Д. Орлоў. Зараз калектыў тэатра прыступіў к узмоцненай падрыхтоўцы да сезона. Адкрыецца сезон у Магілеве 1 кастрычніка п'есай Вірта «Загавор». У сучасны момант заканчваюцца чарнавыя рэпетыцыі п'есы, дэкарацыі. Для афармлення спектакля запрошан Н. Рагачэў — мастак тэатра імя В. І. Неміровіча-Данчэнка. Ставіць спектакль рэжысёр С. Владычанскі.

У кастрычніку будуць таксама выпушчаны прэм'еры «Таленты і паклоннікі» А. Астроўскага, «Каварства і любоў» Шылера, «Егор Булычоў» М. Горкага. Гэтыя тры п'есы былі падрыхтаваны групай выпускнікоў тэатральнага інстытута яшчэ ў Ленінградзе.

Рэпертуар тэатра на сезон 1939-40 года вельмі цікавы і разнастайны. Тэатр пакажа п'есу Эд. Самуйлёнка «Пагібель воўка». Мастацкае кіраўніцтва тэатра намеціла да пастаноўкі п'есу К. Крапівы «Хто смяецца апошнім». Мяркуецца таксама паставіць у бягучым сезоне «Небяспечны паварот» Прыстлі, «Сірано дэ-Бержэрак» Ростна, «Дванаццатая ноч» Шэкспіра, «Павел Грэкаў» Войтэхава і Ленча, «Крэмлёўскія куранты» Пагодзіна.

Тэатр разгортвае вялікую грамадскую работу. На генеральную рэпетыцыю п'есы «Загавор» запрошаны прадстаўнікі гарадскіх і абласных грамадскіх арганізацый.

Рыхтуецца вялікая канцэртная праграма, з якой калектыў тэатра выступіць перад дапрызыўнікамі, выбаршчыкамі выездзе, ў буйнейшыя раённыя цэнтры вобласці.

Тэатр арганізуе сталую кансультацыю для самадзейных драматычных гурткоў на прадпрыемствах, ва ўстановах, ваенных часцях, у калгасах і соўгасах. Для кіраўніцтва кансультацыяй вылучана 12 кваліфіцыраваных творчых работнікаў тэатра. Гарадскі камітэт партыі правёдзіць параду кіраўнікоў тэатра разам з кіраўнікамі партыйных арганізацый горада, на якім будуць абмеркаваны пытанні работы тэатра ў бягучым сезоне.

Я. ТАРАСАЎ.

НЕГАРЭЛАЕ

(Нарыс)

Ёсць станцыі, якія набываюць сабе вядомасць не сваімі вялікімі памерамі, не тым, што дзень і ноч паўз іх шматпавярховыя карпусы імчацца кур'ерскія, хуткія, паштовыя і пасажырскія паязды, у якіх тысячы пасажыраў едуць ва ўсе канцы краіны.

Бахмач, Сінельнікава, Крэменчуг—хто з пасажыраў не чуў аб гэтых важных вузлах? Дзень і ноч шумна на перонах гэтых вакзалаў. Дзесяткі чыгуначных шляхоў густым клубком сплятаюцца тут.

І побач з гэтымі назвамі—маленькая, скромная станцыя, раней зусім невядомая. Ці мала поўстанкаў на нашых неабсяжных шляхах? А Негарэлае іменна было поўстанкам, правільней—палявой станцыяй Александраўскай дарогі.

Паязды тут не затрымліваліся, хіба толькі які-небудзь таварны выпадкова прастаіць на другіх пуцях. Невялікі драўляны дом з газавым ліхтаром ля ўваходу, некалькі прагніўшых дошчак, якія замянялі платформу, традыцыйны плоцік паабапал доміка і шырокія палі навакол. Жыллёвых пабудоў, апрача службовых, не было ніякіх. І хоць над станцыйным домікам было важна напісана «Негарэлае», пажар аднойчы праглынуў гэту хібарку. У 1920 годзе, пасля гераічнага наступлення 16-й Чырвонай Арміі, калі інтэрвенты былі змыты з нашых земляў,—тут, у гэтых месцах лягла дзяржаўная граніца. Рознакаляровыя слупкі кожны з сваім нумарам склалі той неабдымны для вока плот, які аддзяляе землі двух дзяржаў. Ля поўстанка Негарэлае абарвалася шырокая каляя нашых чыгуначных шляхоў. Негарэлае стала брамай у СССР, і гэта хутка стварыла імя поўстанку не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Поўстанак пачаў расці. Да аднаго корпуса далучыўся другі. Там, дзе быў адзін паверх, стала два. Асфальціравалі платформу. Пабудавалі электрастанцыю, якая назаўсёды выгнала адсюль газавыя ліхтары.

Яшчэ год—і адкрылася гасцініца, добры будынак пошты, леглі роўныя вуліцы пасёлка, паабапал якіх выраслі дамы. І пайшла па краіне слава аб Негарэлым—фарпостнай станцыі фарпостнай рэспублікі. У два бакі ад станцыі пралягаюць пуці: улева—шырокія, нашай Заходняй чыгункі, управа—вузкія, Варшаўскай.

Два разы ўдзень прыбываюць сюды экспрэсы. І чыгуначнікі, калгаснікі, пагранічнікі не раз бывалі сведкамі чулых сустрэч людзей, якія пасля доўгай разлукі вярталіся на радзіму.

Любоў да сваёй совецкай зямлі! Тут гэта пачуццё бачыш часта на жывых прыкладах. Прыбыў варшаўскі экспрэс. З няўтульных, нагадваючых клеткі, вагонаў высыпалі пасажыры. Пакінем у баку выпешчаных чужаземцаў, альбо зусім абыякавых да ўсяго, альбо, наадварот, вельмі захопленых «экзотыкай». Вось на перон, проста з верхняй ступенькі вагона саскаквае мужчына, маладжавы на выгляд, добра, але проста апрануты. Прагнымі вачыма аглядаецца навакол і заўважыўшы поблізу пагранічніка, вітаецца:

— Дзень добры, таварыш!

Праз Негарэлае прыехаў у СССР Горкі пасля лячэння заграніцай. Поезд прышоў падвечар. Горкі глядзеў у вокны і глыбока ўдыхаў роднае паветра.

Шмідт і Ушакоў вярнуліся ў СССР пасля чалюскінскай эпапеі праз гэту «браму». І калі на пероне негарэльскага вакзала перад Шмідтам паставілі мікрафон, яго першымі словамі былі словы любві да дарагой радзімы.

Нядаўна аб гэтым-жа гаварылі Коккінакі і Гардзіенка.

— Вітаю, радзіма!—сказалі яны, сыходзячы з чужаземнага цягніка.

— Ну, цяпер, мы дома,—сказаў Уладзімір Канстанцінавіч і паказаў рукою на прасторы, акружаючыя пагранічную станцыю. Паказаў рукою і дадаў:

— Добра!

Тут, у Негарэлым, на самым ускраі совецкай зямлі, у будні і ў святы, у малым і ў вялікім на тысячах прыкладаў адчуваеш і росквіт краіны, і баявы дух совецкіх людзей, пазнаеш гераізм! Шпіёны, падасланыя замежнымі разведкамі, не раз спрабавалі «пешым ходам» праскочыць праз гэтыя месцы і кожны раз з аднолькавым для сябе «рэзультатам». Пагранічнікамі ў такіх выпадках былі пуцявыя абходчыкі, лесарубы, паляўнічыя, калгасныя вартаўнікі, настаўнікі, школьнікі. Многія негарэльцы маюць ордэны і медалі за праяўленую доблесць. Механік мясцовай МТС Ершоў, стрэлачнік Закаблук, калгасніца Яноўская зусім нядаўна былі адзначаны ўрадам за гераізм.

Землі пагранічных негарэльскіх калгасаў даходзяць да самай граніцы. Тут і адбыўся той шырока вядомы выпадак «Ля ручча» з дзяўчынкай, якую шум трактара прыцягнуў з таго боку. Выпадак гэты апісаў Нікалай Вірта і факт гэты пакладзен у аснову праўдзівага кінофільма.

Не на словах, а на справе ператвараюць негарэльцы свой фарпостны ўчастак зямлі ў непрыступную крэпасць абароны. Рэдка хто з мясцовых жыхароў не мае другой, абароннай прафесіі. Касірша станцыі Негарэлае не толькі прадае білеты, яна з'яўляецца адначасова і камандзірам мясцовай санітарнай дружыны, а Негарэльская санітарная дружына, без пераўвелічэння, лічыцца адной з лепшых у СССР. Мясцовыя чыгуначнікі вылучаюцца сваёй трапнай стральбой, а негарэльскія калгаснікі яшчэ ў 1920 годзе на справе даказалі, на якія подвігі здольны простыя совецкія людзі!

Ад запушчанага, закінутага сярод лясоў і палёў поўстанка Негарэлае не засталося і следу, не засталося каменьчыка. На месцы згарэўшага драўлянага доміка вырас вялікі вакзал з выдатным рэстаранам, асфальціраванымі платформамі, вялікім залам пагранічнай службы. Рэстаран аформлен лепшымі совецкімі мастакамі. А недалёка ад вакзала раскінуўся цэлы гарадок—з клубам, школамі, магазінамі, электрастанцыяй,—першы совецкі гарадок ля заходняй граніцы. І недарма тыя, хто доўга адсутнічаў, сыходзячы з прыступак чужога экспрэса, адчуваюць сябе дома, у прывычнай абстаноўцы. Добра апранутыя калгаснікі ходзяць па платформе, чытаюць «Праўду», вывешаную на сценцы. А над станцыйным будынкам лунае сцяг роднай краіны, сцяг СССР.

Тут адчыняецца брама ў цудоўную краіну, брама ў краіну росквіту і радасці.

ЕФ. САДОЎСКІ.



Самадзейны калектыў швейнай фабрыкі імя 8 сакавіка на дэманстрацыі ў дзень 25 гадавіны МЮД'а ў Мінску.

ЭКСПЕДЫЦЫЯ ПА ВЫВУЧЭННЮ ПОМНІКАЎ

З мэтай палепшання аховы помнікаў грамадзянскай вайны, рэволюцыйнага руху, мастацтва і старажытнасці, Соўнарком БССР стварыў цэнтральную ўрадавую камісію па ахове помнікаў у БССР. У склад камісіі ўвайшлі: Начальнік упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР тав. Азірскі А. Б. (старшыня), прэзідэнт Акадэміі навук БССР тав. Горэў К. В., дырэктар інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР акадэмік Нікольскі Н. М., гарадскі архітэктар тав. Якушка Г. В., нарком асветы БССР тав. Уралава Е. П., заслужаны дзеяч мастацтваў тав. Азгур З. І., дырэктар музея Рэволюцыі гор. Мінска тав. Грэкаў Н. Н. і інш.

Пры абласных аргкамітэтах створаны абласныя камісіі па ахове помнікаў.

Урадавая камісія арганізуе ў 1939 годзе навуковыя экспедыцыі ў вобласці з мэтай поўнага выяўлення і навуковага апісання помнікаў. З 1 верасня выехалі экспедыцыі ў Віцебскую, Мінскую і Магілёўскую вобласці.

У Магілёўскай вобласці экспедыцыя абследуе рад цікавых помнікаў: у Бярэзіно будзе абследавана месца баёў, якія адбываліся ў 1812 годзе паміж рускімі войскамі і войскамі французскіх інтэрвентаў. У Бабруйску будуць абследаваны крэпасныя рэдуты 1812 года і крэпасць; у г. Крычаве — агледжана старажытняе гарадзішча-замчышча XII—XIV стагоддзяў і былы палац XVIII стагоддзя, які належаў магнату Глынскаму.

У Магілеве экспедыцыя агледзіць гарадскую ратушу, пабудаваную ў 1679 годзе Стэфанам Баторыем, братнюю магілу рускіх воінаў, загінуўшых у баю з шведамі ў 1708 годзе, і братнюю магілу маскоўскіх стральцоў, загінуўшых у 1661 годзе.

У Мсціслаўлі, адным з старажытнейшых гарадоў БССР, будзе абследавана старажытняе замчышча-гарадзішча, якое мае захаваўшыяся да гэтага часу старадаўнія земляныя ўмацаванні. Тут-жа будуць агледжаны магіла кн. Мсціслаўскіх і будынак былога старажытнага касцёла з фрэскавага жывапісу XVI стагоддзя. У г. Свіслачы будзе абследаван замак 1500 года, у Старым Быхаве — замак Сапегі і старажытняе гарадзішча, у Шклове—гарадская ратуша XVII стагоддзя.

З помнікаў грамадзянскай вайны і гісторыі рэволюцыйнага руху будуць абследаваны: дом у Магілеве, у якім жыў і працаваў Серго Орджанікідзе, магілы герояў чырвонагвардзейцаў Магілёўскага бронеатрада, загінуўшых у баях з белапалякамі. У г. Клічаве — магілы партыйных работнікаў, загінуўшых у 1918 годзе ад рук белабандытаў; у гор. Бабруйску — магілы расстраляных белапалякамі падпольных работнікаў, камуністаў і рад іншых помнікаў у Любонічах, Прапойску, Радомлі, Рэсне, Чавусах, Хоцімску і інш.

У Віцебскай вобласці экспедыцыя папрацуе паўтара месяца. Тут будуць абследаваны і дэтальна апісаны магілы герояў грамадзянскай вайны ў Бачэйкаве, Чашніках, Вушачах, Бешанковічах. У Клясціцах, дзе ў 1812 годзе Віттенштэйн разграміў напалеонаўскага маршала Удзіна, будзе абследавана месца баёў. У Полацку будуць дасканала вывучаны: дом, дзе спыняўся Петр I і старажытныя архітэктурныя помнікі XII стагоддзя: б. Сафійскі сабор і былая царква Ефрасінні, якая мае добра захаваўшыяся сценныя роспісі XII стагоддзя.

У Мінскай вобласці будуць абследаваны братнія магілы геройна загінуўшых у баях з белапалякамі чырвонагвардзейцаў і партызан у Дукорах, Барысаве, Лошніцы, Неманіцы, Хаўхоліцы, Чарневічы, Забашавічах, Старобіне, Ст. Дарогах, Цімкавічах і інш. месцах.

У Заслаўлі экспедыцыя зоймецца абследаваннем старажытнага замчышча і магілы княгіні Рагнеды, дачкі полацкага князя Ратвольда і першай жонкі кіеўскага князя Уладзіміра. У Дзяржынску будзе агледжан замак XVI стагоддзя, у Шацку — каменнае палацо 1790 года, у Прылуках — былы палац магната XVIII стагоддзя, у Нова-Барысаве — Чычагоўскія батарэі 1812 г., у г. Слуцку — сценныя роспісі XVI стагоддзя і рад іншых помнікаў XIV—XVIII стагоддзяў, якія знаходзяцца ў Бягомлі, Грэску, Лудзічах, Копылі, Лагойску, Рудзенску, Дзяржынску, Чэрвені і інш.

ВІННЕР А. В.,—
навуковы кіраўнік экспедыцый па Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях.

ЛЮБОЎ І НЯНАВІСЦЬ

«Любоў» — першы зборнік апавяданняў маладога празаіка Уладзіміра Кандрацені. Ад першай да апошняй старонкі зборнік радуе чытача арыгінальнасцю, жыццёвым аптымізмам, уласным падыходам да вырашэння самых складаных тэм.

Тэматычна ўсе апавяданні зборніка можна падзяліць на два цыклы: першы—«Фінал», «Каля граніцы» — творы пра любоў да краіны Сталінскай Канстытуцыі і пра палымнеючую нянавісць да ворагаў народа, і другі — «Капа сена» і «Каханне» — творы пра нараджэнне новага чалавека, новай маралі совецкіх людзей. Кожны твор Кандрацені — глыбока рэалістычны кавалак жыцця, кожная апісваемая падзея навучае любіць радзіму, народ, партыю і ненавідзець ворагаў — ваўкоў у чалавечым абліччы.

Кандрацення добра зразумеў залатое горкаўскае правіла, што «іменна вобразамі... больш возьмеш, чым словамі, як-бы яны ні былі прыгожы».

Вобраз — персанаж, вобраз — рэч, вобраз — пейзаж у творах Кандрацені адыгрываюць важную ролю, нясуць вялікую ідэйную і мастацкую нагрузку.

...Злосць, звярыная прага гарачай чалавечай крыві прывялі ў нашу краіну з-за мяжы Аркадзя і Уладэка («Фінал»). Яны прышлі помсціць за сваіх бацькоў. На фоне шчаслівага калгаснага жыцця, азаронага рубінавымі крэмлёўскімі зорамі, Аркадзь і Уладэк выступаюць як страшэнныя пачвары.

«Я адпомшчу! — крычыць у экстазе злосці Аркадзь: — Я сам, я сваімі зубамі ўчаплюся ў горла... перагрызу храсткі. Я ўчыню такую расплату, такую... У жылах людзей застыгне кроў, страх агорне самых смелых».

Аркадзь і Уладэк — хітрыя, каварныя ворагі, садысты, прайшоўшыя замежную школу разведкі. Цярпенне і настойлівасць — вось іх дэвіз. Яны настойліва і цярпліва чакаюць моманту, калі ў спіну лепшым людзям нашай краіны можна будзе ўсадзіць халоднае і бліскучае лязо нажа, калі можна будзе напіцца іх гарачай крыві. Злачынны план правальваецца, бо «там, дзе з-пад снегавых намётаў вытыркала чорная павуціна калючага дроту, начную цемру свідравалі сотні вачэй».

Мастацкая сіла апавядання «Фінал» у яго жыццёсцвярджальнасці. Бальшавіцкая праўда заўсёды перамагае — такая ідэя гэтага апавядання.

Ворагі адчуваюць сваё бяссілле. «А мы хіба дужыя? Эх, калега... Лёс наш — яблыка горкае... цягаешся, як воўк, а пятля на шыі», — панура зазначае Уладэк.

Шмат хвалюючых мясцін маем мы ў «Фінале». Малады пісьменнік умела выкарыстоўвае дэталь для стварэння скульптурна-рэльефных вобразаў і сітуацый. Ён даволі скупы на мастацкія фарбы і гэта трэба толькі вітаць. Кандрацення, напрыклад, пачуцці хвалявання перадае двума-трыма мазкамі:

«Нечакана з-за крутога ўзгорка паказалася фурманка. Мужчыны моўчкі хапіліся зашпільваць ватоўкі — з пальцаў выслізгалі непадатлівыя гузікі». Сказана проста і праўдзіва!

Апавяданне «Каля граніцы» — няўдача аўтара. Пячатка рыхласці, вадзяністасці ляжыць на ім. З першых-жа старонак мы сустракаемся з даўно вядомым у літаратуры, па традыцыі пераходзячым з аднаго твора ў другі дзедам-героем, які можа «такую штуку адкалоць, што малады пазайздросціць». Зразумела, дзед Ахрэм жыве на граніцы, ловіць буйнага шпіёна, у якім пазнае былога пана. Жывыя людзі ў гэтым апавяданні заменены драпна адціснутымі гравюрамі.

І «кароткія ногі Ахрэма», і «мудрая жартаўлівасць», і «кірпаты нос», і «скручаная з газеты тоўстая папяроса» — усе гэтыя літаратурныя ўкрасы даўно згубілі сваю мастацкую сілу. Нельга, каб кожны дзед у літаратуры «охаў» і «ахаў». Трэба шукаць больш трапных, сакавітых выразаў і слоў, папаўняць імі свой моўны багаж.

У навеле «Капа сена» пісьменнік б'е па пустой ганарлівасці і паказвае, як у працэсе калектыўнай працы знішчаецца адзінокая адчужанасць, як нябачнымі ніцямі єднае людзей праца. Навелістычны напрамак у сваёй творчасці пісьменнік павінен смялей развіваць і ўдасканальваць.

Значным крокам наперад у творчым развіцці Кандрацені з'яўляецца яго невялікая аповесць «Каханне». У аповесці малады пісьменнік паставіў перад сабою вялікую, цяжкую, але патрэбную тэму — тэму выкарчоўвання перажыткаў капіталізма ў свядомасці людзей. Ідэя твора раскрываецца ў рэпліцы Саўкі:

«От што, чалавеча, Табе і душу трэба падмаладзіць: на ёй многа сажы асела са старога коміна. Завесці-б цябе ў лазню ды венікам, венікам гарачым. Каб тая сажа змылася».

Змест аповесці просты і цікавы. Лятуценнік Алесь кахае Марыну. Марынін бацька Арцём ганарыцца сваёй дачкой і жадае прыдбаць для яе нейкага асаблівага жаніха. У імя гэтага ён марыць аб вялікім пасагу.

Едучы ў раён, Алесь згубіў партфель з грамадскімі грашыма. Арцём, пасвячы коней, знайшоў партфель. Ён хавае грошы, мучыцца ад гэтага, ночы не спіць: барацьба новага пачуцця са старым не дае яму спакою. Тры рублі Арцёма, якія ён згубіў у кааператыве, і якія яму вярнулі, робяць пераварот у яго свядомасці. Новае пачуццё ўрэшце перамагае закопчаныя дымам старыя погляды Арцёма.

Самым удалым вобразам аповесці, зразумела, з'яўляецца Арцём, бо на ім сканцэнтравана ўся ўвага пісьменніка.

Працэс перавыхавання Арцёма не вокамгненны, як гэта бывае ў некаторых пісьменнікаў, а доўгі і цяжкі, а таму натуральны і глыбока рэалістычны. Вобраз Арцёма выпісан пісьменнікам усебакова. Арцём — жывы чалавек, хвалюючы і цэльны характар. Арцёму супроцьстаўляецца кульгавы Саўка — чалавек з чыстым сэрцам, вялікі аптыміст. Саўка — гэта ўвасабленне народнай чыстаты, народнай прыгожасці, народнай мудрасці.

Гэтыя два персанажы раскрываюцца паралельна: паміж імі адбываецца толькі ўнутраная, душэўная барацьба. Ад вонкавай сутычкі Арцёма і Саўкі аповесць значна выйграла-б.

Менш рэльефна ў аповесці абмаляваны лятуценнік Алесь і яго каханая Марына. Марына і Алесь — персанажы, перакачаваўшыя ў аповесць Кандрацені з прачытаных кніжак. Аб іх аўтар больш расказвае, чым паказвае іх праз бытавую дэталь, факт, падзею. Гэтым двум вобразам нехапае «душы». Яны поўжывыя, абяскроўленыя пісьменнікам людзі.

Аповесць «Каханне» — рэалістычны твор пра нараджэнне новага чалавека.

Разглядаемы зборнік не пазбаўлен і буйных недахопаў. Амаль на ўсіх творах мы адчуваем налёт сантыментальнасці, якая зніжае іх мастацкую вартасць. Мова многіх твораў зборніка празмерна квяцістая, многаслоўная. Не заўсёды аўтар адбірае самае характэрнае, самае трапнае і жывучае слова з народнай мовы. Сустракаецца нямала правінцыялізмаў, накшталт «трэнак», «ладка», «звярэджаныя», «вытыркала», не заўсёды пісьменніку хапае назіральнасці.

Увогуле-ж зборнік твораў Уладзіміра Кандрацені «Любоў» гаворыць аб вялікіх магчымасцях маладога празаіка.

Пав. ХАДАРЭНКА.

В. БАРЫСЕНКА

Паэмы Паўлюка Труса

Паэмы П. Труса займаюць у яго літаратурнай спадчыне досыць вялікае месца. Першая паэма «Юны змагаец» напісана ім у 1925 годзе. У паэме распрацоўваецца тэма грамадзянскай вайны, даецца ўсхваляваны расказ аб гераічных людзях, удзельніках грамадзянскай вайны, і іх баявых справах. Паэт услаўляе і новае жыццё, прынесенае і заснаванае рэволюцыяй. Цёпла, з глыбокім лірызмам расказвае П. Трус пра адданасць рэволюцыі лепшых сыноў беларускага народа, пра іх веру ў перамогу. Паэт выражае гэтым лепшыя пачуцці многамільённай арміі працоўнага народа, якая пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі змагалася за соцыялізм.

Другая паэма П. Труса — «Астрожнік»—таксама напісана ў 1925 г. Твор гэты выразна дзеліцца на чатыры часткі, скрозь якія праходзіць толькі адзін вобраз гераічнага комсамольца. Лірычны вобраз аўтара тут поўнасцю зліваецца з вобразамі героя. Голас героя — гэта лірычны голас самога паэта.

Не спыняючыся, як гэта было ўласціва паэту ў большасці яго твораў, на апісанні знадворнага партрэта героя, П. Трус лаканічна замалёўвае паасобныя рысы псіхалагічнага партрэта. Якім — мужны і стойкі комсамолец, беззаветна адданы справе «магутнага КІМ'а». Адважны і горды малады арол — комсамолец Якім стойка змагаецца і горда і мужна паміраэ за шчасце працоўных.

У вобразе Якіма паэту ўдалося абагуліць некаторыя з найбольш тыповых рысаў псіхалагічнага вобліка комсамольца. Яму ўдалося ў нагладных мастацкіх вобразах адлюстраваць гэроіку рэволюцыйнай барацьбы комсамола, вернага памочніка партыі, супроць заклятых ворагаў беларускага народа — белапольскіх акупантаў.

Лірычны, эмацыянальна-напружаны маналог з'яўляецца асноўным спосабам раскрыцця героя. У маналогу тонка і гармачна перапляталюцца ідэйныя і грамадзянскія матывы. Вобраз Якіма вызначаецца цэльнасцю, і гэта лішні раз падкрэслівае кроўную сувязь, радство паэта з пролетарскай рэволюцыяй.

А колькі ў лірычным маналогу натуральнай, шчырай задушэўнасці, цеплыні, высокай эмацыянальнасці, якая нарастае з радка ў радок!

Трагічная смерць комсамольца, які гіне за справу працоўных, — цэнтральная тэма твора, — пераплятаецца з пейзажнымі і жанравымі матывамі. Трагізм смерці маладога астрожніка значна ўзмацняецца праз супастаўленне наступаючай хвіліны смерці са звычайным ходам вясковага жыцця, з прыгожымі малюнкамі прыроды.

Жанравыя матывы і вобразы прыроды войстра драматызіруюць разгортваемыя ў творы падзеі, агаляюць іх сутнасць і глыбіню. Прырода з'яўляецца як-бы ўдзельнікам падзей. Земныя і нябесныя стыхіі жыва адклікаюцца на падзеі, прырода тут як-бы жыве радасцямі і пакутамі героя. «Нешта вецер гудзе на мяжы»; «над магілай асеннія сцюжы» збіраюцца спяваць словы Якіма; таполі ціха шумелі, «шалясцелі асенняй жудой»; зара ў апошні раз цалавала свайго любімца-паўстанца; гай на смерць Якіма адказаў галосным шумам.

Прырода, паладзеная, як мы бачым, у чыста фальклорным плане, узмацняе багацце паэтычных фарбаў твора.

У кампазіцыйных адносінах твор вызначаецца стройнасцю пабудовы. Лірычны маналог — цэнтральная і асноўная частка твора — дасягае значнага мастацкага эфекта дзякуючы сваяму месцу ў агульнай кампазіцыі. Лірычны маналог абрамляецца пейзажнымі і жанравымі матывамі.

У ідэйным развіцці паэта вялікае і важнае месца займае ліра-паэма «Чырвоныя ружы». Напісанне паэмы прыпадае на канец 1928 і пачатак 1929 года. «Чырвоныя ружы» — вялікі крок пісьменніка ў напрамку да яшчэ большага авалодання стылем поўнакроўнага совецкага рэалізма. У гэтым творы пісьменнік падымаецца да разумення соцыяльных і інтэрнацыянальных задач нашай рэволюцыі.

Грамадзянская вайна ў паэме «Чырвоныя ружы» ўжо не паказваецца пісьменнікам, як гэта было ўласціва яго ранейшым творам, як адна толькі партызаншчына. Пісьменніку ўдалося паглядзець на грамадзянскую вайну, як на арганізаваны, мэтаімкнёны, строга акрэслены свядомай воляю працэс. Вобразы Чырвонай Арміі падаюцца ў форме былiннай рамантыкі.

У рэволюцыйна-рамантычных вобразах паэт разгортвае перад намі жыццё совецкай краіны ва ўмовах мірнага будаўніцтва. Светламу жыццю совецкай краіны, шырокаму размаху соцыялістычнага будаўніцтва паэт спявае натхнёныя гімны, якія напоўнены радасцю жыцця і пачуццямі любві і адданасці рэволюцыі.

Заключным акордам без пары замоўкнуўшай ліры П. Труса з'яўляецца вядомая паэма «Дзесяты падмурак». Паэма гэта ў ідэйных і мастацкіх адносінах — найбольш спелы твор П. Труса. Паэма «Дзесяты падмурак» з усёй неаспрэчваемай відавочнасцю паказвае на творчы рост пісьменніка, на размах яго рэалістычнага таленту.

У паэме з глыбокай гістарычнай праўдзівасцю адлюстраван працэс ператварэння Беларусі з «края палёў» у «край фабрык дымных і машын», адлюстравана трыумфальнае шэсце соцыялізма.

Сумнае і жахлівае мінулае беларускага народа і светлае, сонечнае сёння Совецкай Беларусі — гэткія асноўныя тэматычныя лініі «Дзесятага падмурка». Рэалістычнаму паказу старой Беларусі папярэднічае лірычны ўступ у форме псіхалагічнага пейзажа. Вобразы прыроды адыгрываюць экспазіцыйную ролю. Тэма адкрываецца пейзажным вобразам снежнай зімы, паказам ціхага зімовага вечара.

Прырода падаецца ў падкрэслена-аптымістычных тонах.

Твор складаецца з чатырох раздзелаў. Дзве першыя часткі прысвечаны паказу дакастрычніцкай Беларусі, трэцяя — Совецкай Беларусі і апошняя, заключная—паказу рэволюцыйнага змагання працоўных мас Заходняй Беларусі.

Паэт падае вобраз мінулага Беларусі праз рэалістычнае раскрыццё соцыяльнага і нацыянальнага гнёту, ва ўмовах якога жылі ў часы царызма працоўныя масы беларускага народа. Мінулае Беларусі праходзіць перад вачыма паэта як цяжкі, жахлівы сон. Кампазіцыйны прыём сну, якім карыстаецца аўтар пры паказе мінулага беларускага народа, удала дапамагае раскрыць жудасці і пакуты працоўных мас Беларусі ва ўмовах соцыяльнага і нацыянальнага ўціску. Беларусь —гэта ў мінулым краіна «легенд, крыжоў, магіл-курганаў», гэта «край тугі». Стогны, плач, праклёны, сумныя песні раздаюцца на прасторах прыгнечанай краіны, усё агорнута сумам і смугою.

Намаляваўшы рэалістычны вобраз Беларусі ў мінулым, як краіны цемры, гнёту і жабрацтва працоўных мас, паэт пераходзіць ад сабіральнага вобраза краіны да падачы паасобных вобразаў людзей, у якіх увасабляецца народная нядоля. У фальклорна-казачным стылі вытрыман паэтычны паказ маткі і сына, у якіх увасоблены прадстаўнікі бядняцкіх мас беларускага народа.

Лірычны вобраз аўтара зліваецца з вобразам сына. Псіхалагічны і соцыяльны воблік сына раскрываецца ў форме лірычнага маналога, накіраванага да маткі. У маналогу, як і ў песні жабракоў і праклёнах маткі, асноўным матывам гучыць скарга на цяжкую долю працоўных мас.

У другім раздзеле твора разгортваюцца жахлівыя і крывавыя абразкі імперыялістычнай вайны, якая прынесла з сабою смерць, разруху, пажары і паглыбленне народных пакут і жабрацтва.

Такімі ўстаюць перад намі вобраз Беларусі ў мінулым — адсталай калоніі расійскага самаўладства—і жабрацкае жыццё працоўных мас беларускага народа.

Як поўная процілегласць вобразу мінулай Беларусі, падаецца светлы вобраз Совецкай Беларусі. Толькі пры совецкай уладзе Беларусь перастала быць краем «крыжоў, магіл-курганаў»: толькі ва ўмовах совецкай улады Беларусь ператварылася ў квітнеючую краіну,—такая асноўная ідэя паэмы ў цэлым. Совецкая Беларусь, у процілегласць мінулай Беларусі, край «громаў-навальніц», край, «дзе пульсуе радасць» і шпаркімі тэмпамі будуецца соцыялізм.

Совецкай Беларусі паэт прысвячае прачулыя словы. Ён з вялікім захапленнем вітае і апявае шырокі размах соцыялістычнага будаўніцтва, рост і небывалы росквіт культуры.

У трэцім раздзеле П. Трус красачна адлюстроўвае працэс гаспадарчага і культурнага росту Совецкай Беларусі, працэс ператварэння Беларусі з адсталай аграрнай краіны ў краіну соцыялістычных фабрык і машын. Рэалістычна адлюстроўваючы працэсы соцыялістычнай індустрыялізацыі Беларусі, П. Трус ярка выразіў пачуццё любві да сваёй радзімы, радасць за яе светлае жыццё і веру ў яе сонечную будучыню, г. зн. выразіў у сваім творы пачуцці і эмоцыі, якімі жывуць працоўныя нашай краіны.

Заключны раздзел паэмы прысвячаецца паказу нарастання рэволюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі ва ўмовах страшэннага гнёту і ўціску. Паэт правільна і глыбока паказвае ўздым і нарастанне рэволюцыйнага руху ў капіталістычных краінах у сувязі з шырокім разгортваннем соцыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне. Магутны рост совецкай краіны рэволюцыянізіруе свядомасць працоўных мас капіталістычных краін.

Гэткія асноўныя моманты зместу ліра-эпічнай паэмы «Дзесяты падмурак».

Паэма «Дзесяты падмурак» падымаецца над усімі паэтычнымі творамі П. Труса як па сваёй ідэйнай вышыні, так і па мастацкай якасці. У гэтым творы мы маем найбольш яркае спалучэнне рэалізма і рамантызма. Народныя элементы, якія сказваюцца па лініі зместу ў праўдзівым паказе рэчаіснасці і выражэнні народных пачуццяў, знаходзяць сваю аб'ектывізацыю і замацаванне па лініі формы ў народных па характару і духу вобразах.

Кідаецца ў вочы багатая, вобразна-сімвалічная насычанасць твора. Красачная, рознастайная сімволіка і паэтычныя ўвасабленні з'яўляюцца ўлюбёным паэтычным сродкам паэта для раскрыцця падзей, з'яў, працэсаў і г. д. Так, напрыклад, шчаслівае жыццё Совецкай Беларусі сімвалізіруецца ў вобразе светлых агнёў соцыялістычнага будаўніцтва. Соцыялістычная рэволюцыя падаецца ў вобразе сонца. Совецкая Беларусь сімвалізіруецца ў вобразе края «громаў-навальніц» і г. д.

Сімвалы, паэтычныя ўвасабленні, раскрываючыя ў абагуленых вобразах тыповыя бакі рэчаіснасці, ідуць ад народнай творчасці.

Паэтычная мова твора яркая па сваёй вобразнасці і простая. Мова цягнецца па сваіх прыёмах да паэтычных прыёмаў, уласцівых народнай творчасці. Мы ў свой час адзначалі ярка выражаную метафарычнасць, як асноўную адзнаку паэтычнага стылю паэта. І гэта асаблівасць паэтычнай мовы, мабыць, нідзе так ярка не сказалася, як у творы «Дзесяты падмурак».

У «Дзесятым падмурку» падзеі, з'явы раскрываюцца не прама, а метафарычна. Так, перамога рэволюцыі паказваецца ў вобразе панавання радасці: «І пульсуе радасць у прасторах, залатыя свецяцца агні»; гераічныя дні грамадзянскай вайны і барацьбы за Кастрычнік раскрываюцца праз такі вобраз: «Дні прайшлі, адшалясцелі зоры на гарачых крыллях навальніц». Страшэнны соцыяльны прыгнёт у мінулым раскрываецца ў вобразе панавання ночы, панавання хмар і г. д.

У метафарах і параўнаннях прысутнічаюць элементы сімволікі. Паэт карыстаецца пашыранымі параўнаннямі. Асаблівай любоўю карыстаюцца ў паэта так званыя адмоўныя параўнанні («Не каліна над вадою пахіліла голле,—плача маці сярод поля, праклінае долю»).

Яркая вобразнасць звязана з ужываннем дакладных і яркіх эпітэтаў, сярод якіх пачэснае месца займаюць так званыя сталыя традыцыйныя эпітэты. Пададзім прыклады найбольш шырока ўжываемых эпітэтаў: «шоўкавыя косы», «чыстае поле», «буйныя ветры», «цёмны гай», «залатая восень», «шоўкавыя руні», «чорная смуга».

Асаблівую эмацыянальнасць надаюць паэтычнай мове П. Труса паўторы і звароты. Паўторы ўжываюцца самых рознастайных відаў: паўторы адной літары, цэлых слоў, асобных радкоў і нават цэлых строф.

У паэтычнай мове «Дзесятага падмурка» выяўлены лепшыя элементы і ўласцівасці паэтычнай мовы аўтара. У паэме ў цэлым і ў мове гэтага твора ў прыватнасці моцна адчуваюцца фальклорныя песенныя матывы. Яны адчуваюцца ў самых рознастайных кампанентах твора: у вобразнай сістэме, у кампазіцыі, у стылістыцы і рытміцы. Па сваёй інтанацыі мова данага твора цягнецца да беларускай народнай песні. Антытэза і кантраст—асноўныя кампазіцыйныя прыёмы, на прынцыпах якіх будуецца твор у цэлым. «Дзесяты падмурак» не мае строгай сюжэтнай лініі. Развіццё твора рухаецца на аснове паступовага пералічэння падзей і гістарычных з'яў.

П. Трус з першых дзён свайго прыходу ў беларускую літаратуру мог стаў на пазіцыях совецкай літаратуры і сваімі паэмамі і лірычнымі вершамі ўнёс вялікі ўклад у беларускую совецкую літаратуру.

ДА ДЭКАДЫ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА Ў МАСКВЕ

ЗРОБІМ ВЫСОКАМАСТАЦКІЯ СПЕКТАКЛІ

Калектыў Вялікага дзяржаўнага тэатра оперы і балета дзейсна рыхтуецца да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Дзякуючы клопатам партыі і ўрада, тэатр мае ўсе ўмовы для паспяховай работы. Тэатр укамплектаван высокакваліфіцыраванымі спецыялістамі. Мастацкім кіраўніком і галоўным рэжысёрам тэатра працуе засл. арт. РСФСР І. Ю. Шлепянаў. Першай яго работай для дэкады з'яўляецца опера «Дрыгва», якая карыстаецца ў гледача заслужаным поспехам. Калектыў тэатра мае ў асобе тав. Шлепянава таленавітага рэжысёра і мастака.

Я асабіста буду працаваць з тав. Шлепянавым у оперы «Кветка шчасця» кампазітара А. Е. Туранкова. Выконваю ролю Надзейкі.

Рэжысёрам спектакля «Міхась Падгорны» з'яўляецца П. С. Златагораў. Дапамога тав. Златагорава — рэжысёра тэатра імя Немировіча-Данчэнка, рэжысёра-педагога па лініі акцёрскага майстэрства дае нам вельмі многа. Працуючы зараз з ім у партыі Марысі (опера «Міхась Падгорны»), я зусім па-новаму падыходжу да раскрыцця вобраза. Працаваць з тав. Златагоравым вельмі лёгка. Кожны кавалачак ролі робіцца з любоўю, дэталёва распрацоўваецца, усё проста і апраўдана.

Такая рэжысура, бясспрэчна, дае магчымасць зрабіць гэтыя два спектаклі—«Міхась Падгорны» і «Кветка шчасця» — мастацка праўдзівымі, вартымі дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

Работа, якая ідзе зараз над балетам «Салавей», дае таксама падставу меркаваць, што спектакль будзе цікавым. Балетны калектыў, у большасці здольны і таленавіты, пад кіраўніцтвам такіх спецыялістаў, як засл. арт. РСФСР Ф. В. Лапухоў, засл. арт. РСФСР ордэнаносец А. Н. Ермалаеў, дырыжор М. Э. Шнейдэрман, зробіць балет «Салавей» вельмі цікавым спектаклем.

Для ўзняцця вакальнай культуры салістаў дырэкцыя і мастацкае кіраўніцтва тэатра прымацавалі да салістаў педагога-вакаліста тав. Вастокава і дырыжора Ратнера, які паралельна з работай над opернымі партыямі ўдасканальвае камерны рэпертуар салістаў.

Артысты хора таксама займаюцца па вакалу з засл. арт. рэс. Мурамцавым, артыстамі Таланкіным, Лапаціным, Васкрэсенскай, што мае і будзе мець станоўчы ўплыў на спектаклі. Сярод артыстаў хора ёсць маладыя здольныя спевакі, якія могуць быць скарыстаны на адказных ролях, напрыклад, тав. Лазараў (лірыка-драматычны тэнар).

Малады дырыжор тэатра тав. А. В. Ратнер—удзельнік усесаюзнага конкурса дырыжораў — з вялікай любоўю працуе над операй «Кветка шчасця». Можна спадзявацца, што работа гэтага здольнага дырыжора дасць станоўчыя рэзультаты.

Над дэкаднымі спектаклямі працуюць і галоўны дырыжор тэатра ордэнаносец тав. Н. Б. Грубін («Дрыгва»), дырыжор М. Э. Шнейдэрман («Міхась Падгорны»).

Укамплектаванне тэатра высокакваліфіцыраванымі спецыялістамі ўжо дало свае вынікі. Многія акторы тэатра, дзякуючы рабоце з майстрамі, выраслі, разгарнулі свае здольнасці (Друкер, Цярэнцеў, Шчацікін і інш.).

Нашы поспехі былі-б значна большымі, калі-б у тэатры была ў дастатковай меры разгорнута грамадская работа, соцыялістычнае спаборніцтва. Нажаль, да апошняга часу грамадская работа ў тэатры не была на адпаведнай вышыні. Соцыялістычнае спаборніцтва паміж цэхамі і паасобнымі работнікамі не было разгорнута. Толькі ў апошні час грамадскія арганізацыі пачынаюць праводзіць некаторую палітыка-выхаваўчую работу. Днямі калектыў пераабраў свой мясцком. Зараз у яго ўваходзяць актыўныя творчыя работнікі: засл. арт. рэсп. Мурамцаў і Дзянісаў, артысты Калінoўскі, Пінно, Таланкін, Левіна інш. Трэба спадзявацца, што новыя работнікі мясцкома пры дапамозе ўсяго калектыва тэатра арганізуюць шырокае соцыялістычнае спаборніцтва ўсіх членаў калектыва, наладзяць вытворчыя нарады, без якіх падрыхтоўка спектакляў да дэкады немагчыма.

У тэатры існуе мастацкі совет, але ён сабіраўся адзін-два разы і больш аб ім не чуваць. Я лічу, што мастацкі совет, у які ўваходзяць мастакі, скульптары, рэжысёры, вядучыя акторы іншых нашых тэатраў, павінен дапамагчы кіраўніцтву і калектыву тэатра ў яго рабоце.

Начальнік Упраўлення па справах мастацтваў т. Азірскі аддае падрыхтоўцы да дэкады вялікую ўвагу, часта наведвае тэатр. Хацелася-б бачыць тав. Азірскага часцей сярод салістаў оперы. Добра было-б, каб ён сабраў актораў тэатра, пагутарыў з намі аб падрыхтоўцы да дэкады, даў-бы творчую зарадку і т. д.

Калектыў тэатра гарыць вялікім жаданнем працаваць, зрабіць спектаклі высокамастацкімі, поўнасцю апраўдаць клопаты партыі і ўрада аб росквіце беларускага мастацтва і заслужыць добрую ацэнку маскоўскіх гледачоў, урада СССР і вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна.

Р. В. МЛОДЭК.
Засл. арт. БССР.

ПАЧЭСНЫ АБАВЯЗАК ПАЭТАЎ

Нельга сказаць, што ўсе беларускія совецкія паэты актыўна ўдзельнічаюць у справе падрыхтоўкі да дэкады беларускага совецкага мастацтва ў Маскве.

Справа напісання песень, прысвечаных дэкадзе, — першачарговая задача паэтаў. Аднак, трэба сказаць, што ёсць паэты, якія яшчэ нічога не зрабілі, а некаторыя таварышы хоць і напісалі, але мала і не заўсёды добрай якасці. Асобна трэба адзначыць плённую работу народных паэтаў Якуба Коласа, Янкі Купалы, тав. Кандрата Крапівы і некаторых другіх паэтаў і пісьменнікаў.

Абавязак беларускіх совецкіх паэтаў— напісаць па некалькі варыянтаў тэкстаў на кожную тэму, таксама як і кампазітарам неабходна стварыць па некалькі варыянтаў музыкі. На апошнім пасяджэнні секцыі паэтаў узнікла цікавая думка, якую мы абавязкова павінны здзейсніць: трэба склікаць агульны сход паэтаў і кампазітараў, на якім праслухаць тэксты і музыку ўжо гатовых песень, а таксама добра сумесна абмеркаваць справу напісання новых песень.

Можна меркаваць, што ў часе дэкады беларускага совецкага мастацтва ў Маскве будуць практыкавацца выступленні паэтаў на прадпрыемствах і ў клубах чырвонай сталіцы. Падрыхтаваць творы да выступленняў, напісаць творы, прысвечаныя дэкадзе — наш абавязак. Трэба загадзя прадумаць нават і справу арганізацыі літаратурных вечароў.

Некалькі паэтаў удзельнічалі ў напісанні лібрэта для беларускіх совецкіх опер. Калі мы напішам яшчэ добрыя тэксты песень і як след падрыхтуемся да літаратурных выступленняў у часе дэкады, — дык наш паэтычны абавязак будзе выканан.

ПЯТРУСЬ БРОЎКА.

Філармонія да дэкады

Пры Філармоніі БССР у дапамогу кампазітарам і для падрыхтоўкі рэпертуара да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве створана творчая камісія ў складзе Шчаглова (старшыня), Туранкова, Шікоцкага, Млодэк, Арсенка, Рудніка, Бары, Гітліца, Мілош і Бельскага.

ОПЕРА „КВЕТКА ШЧАСЦЯ“

Вялікі Дзяржаўны тэатр оперы і балета зараз узмоцнена працуе над пастаноўкай оперы дэпутата Вярхоўнага Совета БССР кампазітара А. Е. Туранкова паводле лібрэта паэтаў - ордэнаносцаў П. Броўка і П. Глебка. Опера ўключана ў лік спектакляў, якія будуць паказаны ў пачатку будучага года на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве.

У гутарцы з супрацоўнікам рэдакцыі газеты «Літаратура і Мастацтва» тав. Туранкоў паведаміў аб ходзе работы над операй.

— Прэм'ера оперы «Кветка шчасця» намечана на лістапад бягучага года. Увесь калектыў, які працуе над операй, гарыць жаданнем выканаць свае абавязацельствы да тэрміна.

Салісты і хоры прыступілі да рэпетыцый у канцы жніўня, аркестр некалькі дзяней. Работа ідзе над першымі двума актамі. Заканчваецца распісванне партый трэцяга акта.

Мастацкі кіраўнік і галоўны рэжысёр тэатра засл. арт. РСФСР І. Ю. Шлепянаў працуе над пастановачным планам і мастацкім афармленнем спектакля. Конкурс на лепшае афармленне оперы, абвешчаны тэатрам, даў перамогу маладому мастаку Л. Кролю. Яго эскізы прызнаны найбольш удалымі.

Наогул, опера «Кветка шчасця» абяцае быць яркай і цікавай. Пастаноўка, афармленне і выкананне — усё будзе прасякнута народнымі матывамі, фальклорам. У оперы шмат папулярных народных танцаў і песень.

Задача калектыва тэатра падрыхтаваць спектакль, сапраўды варты паказу ў Маскве перад урадам СССР і вялікім Сталіным.



На здымку: мануменг С. М. Кіраву, устаноўлены ля павільёна «Ленінград і Паўночны Ўсход». Фотахроніка ТАСС.

НОВЫЯ РАБОТЫ КАМПАЗІТАРА-ОРДЭНАНОСЦА І. О. ДУНАЕЎСКАГА

— «У апошнія дні я закончыў аперэту «Шляхі к шчасцю»—паведаміў нашаму карэспандэнту кампазітар-ордэнаносец, дэпутат Вярхоўнага Совета РСФСР І. О. Дунаеўскі.—Незамысловатая, але вельмі прыемная і даходлівая фабула п'есы і добрыя вершы А. д'Акціля дазволілі мне стварыць вялікі музычна-драматычны твор з шырокімі меладычнымі абагульненнямі і развітымі вакальнымі формамі. Ленінградскі глядач убачыць гэту аперэту, напэўна, яшчэ ў гэтым годзе ў тэатры Музкамедыі. Выканаўцам і тэатру прыдзецца шмат папрацаваць, бо аперэта прадстаўляе для іх некалькі незвычайныя цяжкасці. Гэта тлумачыцца ўласцівасцю самой музыкі, работу над якой я разглядаў, як «трамплін» да маёй будучай оперы «Рашэль».

Пасля паўтарагадовага перапынку ў рабоце для кіно я маю цяпер тры сцэнарыі, да якіх буду пісаць і часткова пачаў ужо пісаць музыку. Гэта, па-першае, «Золушка»—вялікі і цікавы фільм, ажыццяўляемы нашым творчым калектывам (рэжысёр Аляксандраў, Любоў Орлова, Лебедзеў-Кумач і я). З рэжысёрам В. Корш і паэтам М. Светловым буду працаваць над фільмам «Мая любоў». У гэтым фільме мяне цікавіць магчымасць паглыблення маёй работы над лірычнай маладзёжнай песняй. З рэжысёрам В. Вайншток і паэтам С. Міхалковым буду працаваць над фільмам «Стрэл у гарах». Гэта—фільм аб выхаванцах спецшкол, аб іх вучобе, пачуццях, дружбе і гераічных учынках. Тут шырокая магчымасць стварэння музыкі і песень для юнацтва. Акрамя таго, я закончыў музыку да аднагадзіннага мультфільма «Цырк» (рэжысёры тт. Сюмкін і Сініцын).

За мінулыя месяцы гэтага года я напісаў сем песень: «Аб Сталінскім наркоме» (тэкст Малчанава), «За края советские» (тэкст Рэшэтова), «Колеса, бегите» (тэкст Валжэніна), «Славься, Родина!» (песня аб выстаўцы на тэкст Дабравольскага) і іншыя. Гэтыя песні зданы мною ў друк і ў недалёкім будучым будуць выданы.

Прадстаячы ў 1940 годзе стогадовы юбілей з дня нараджэння П. І. Чайкоўскага я збіраюся адзначыць у сваёй творчасці стварэннем аркестровай сюіты «Чайковіана». Чайкоўскі — любімейшы мой кампазітар, чыя творчасць з самых маіх першых крокаў і да гэтага часу аказвала і аказвае на мяне велізарны ўплыў. Гэту любоў маю да геніяльнага кампазітара я і хачу выразіць у сюіце, якая будзе ўяўляць сабою рад мініацюр для аркестра, напісаных у стылі і манеры музыкі Чайкоўскага.

Паралельна з гэтым будзе бесперапынна працягвацца работа над операй «Рашэль» (лібрэта М. Булгакова па Гюі дэ Мапасану)».

А. МАЙСЕЕЎ.

Ленінград. (Наш кар.).



Н. Шчорс — скульптура работы А. Ш. Ізмалкова, выкананая па заказу Клінцоўскага горсовета.

Павел Пранузa

Вячэрняе возера

Камары ў паветры пругкім звоняць,
Асака і лазнякі маўчаць.
Палажылі пяжкія далоні
Лапухі зялёныя на гладзь

Возера, з адценнем пурпуровым,
У якое ўпаў нябёс блакіт.
Паўздымалі жоўтыя галовы
Над вадой празрыстай куўшынкі.

Валавянай плямай месяц поўны
Лёг на дно, што за смалу чарней.
Вецярок з прахладаю раптоўна
Асцярожна травы пахісне —

Прабягуць па возеры маршчыны,
Вадзяны скамячыўшы абрус...
У лузе гулкі голас жураўліны
Прадвяшчае ўпэўнена зару.

Дождж

Сышліся чорныя дзве хмары,
Як два варожыя палкі.
На небе гром загаспадарыў,
Маланка сінія клыкі
Імгненна вышчарыла злосна
І асляпіла далягляд.
Знянацку дождж напаў на сосны,
На светлы, кучаравы сад.

І кроплі шротам білі ў травы,
У шыбы, у жалезны дах.
З узгоркаў веснавым напевам
Зайграла мутная вада.
І хмары разышліся шпарка,
Як быццам заключылі мір.
Прыгрэла сонца. Ад прыпаркі
Зямля абмытая дыміць.

У ТЭАТРЫ ЮНАГА ГЛЕДАЧА

Калектыў тэатра юнага гледача БССР вярнуўся з свайго чарговага адпачынку і з новымі сіламі прыступіў да работы па падрыхтоўцы да адкрыцця сезона.

Вялікая група актораў тэатра ў гэтым годзе правяла свой адпачынак у горна-альпінійскіх лагерах «Рот фронт» і «Мастацтва», якія знаходзяцца на цудоўных схілах Каўказскага хрыбта. Уся група тэатра Юнага гледача выйшла на выдатна як па курсу практычных, так і тэарэтычных ведаў па альпінізму і здала экзамен на значок альпініста і турыста СССР. Сваю вучобу ў лагерах акторы закончылі вельмі цікавым заліковым 150-кіламетровым пераходам па маршруту: Паўночны Каўказ — Клухорскі перавал — Сухумі. Другая група актораў у час свайго адпачынку наведала Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку.

2-га верасня вярнулася ў Мінск лагерная канцэртная брыгада тэатра, якая больш месяца раз'язджала па лагерах рэспублікі.

Наступаючыя ў тэатр водзывы ад піонерважатых і педагогаў сведчаць аб тым, што канцэрты тэатра ў гэтым годзе, як па свайму зместу, так і па мастацкай якасці задаволілі юных гледачоў. Брыгада тэатра абслужыла канцэртнымі выступленнямі каля 6.000 школьнікаў і піонераў Мінскай і Віцебскай абласцей. Апрача сваіх канцэртных выступленняў артысты тэатра разам з піонерамі праводзілі развучванне песень, танцаў і гульняў.

Зараз калектыў тэатра Юнага гледача з вялікім энтузіязмам і натхненнем рыхтуецца да адкрыцця новага сезона 1939—40 года.

10-га верасня тэатр шырока раскрыў свае дзверы для школьнікаў гор. Мінска. У гэты дзень была паказана прэм'ера «Брат героя» Льва Касіля. Гэта фактычна першы спектакль аб совецкай школе. Паставіў спектакль ленінградскі рэжысёр З. М. Ерухімовіч.

Падрыхтаван спектакль «Цудоўная дудка» Віт. Вольскага. Прэм'ера адбудзецца ў бліжэйшыя дні. Ставіць пастаноўку засл. артыст БССР Е. А. Міровіч, мастак О. П. Марыкс, музыка—Н. Н. Шчэглова.

Запрошаны на сталую работу рэжысёра Р. Р. Сусловіч падрыхтоўвае пастаноўку новай п'есы—казку «Снежная каралева» Е. Шварца па матывах андэрсенаўскіх казак у перакладзе Янкі Маўра.

Новы сезон бягучага года пройдзе пад знакам падрыхтоўкі да дэкады тэатраў Юнага гледача СССР, якая адбудзецца ў пачатку студзеня 1940 года ў Маскве.

На праглядзе ў Маскве тэатр пакажа дзве арыгінальныя беларускія п'есы: п'есу В. Вольскага «Цудоўная дудка» і новую п'есу маладых драматургаў Н. Н. Таубе і М. Блісцінава аб совецкай школе, над якой працуюць аўтары сумесна з тэатрам.

Пры ЦК ЛКСМБ створана рэдкалегія па выпуску спецыяльнай брашуры аб творчым шляху тэатра. Брашура будзе выдана к паездцы тэатра ў Маскву. У будучым сезоне 1940 года тэатр Юнага гледача БССР будзе працаваць над казкай М. Святлова аб марах совецкай моладзі (пастаноўшчык Р. Р. Сусловіч), гістарычнай п'есай драматурга Сізавай аб першым рускім вучоным М. В. Ламаносаве (пастаноўшчык Е. А. Міровіч). Класічны рэпертуар у гэтым годзе будзе прадстаўлен вядомай камедыяй Мальера «Праздзелкі Скапена». Для ажыццяўлення гэтага спектакля тэатр запрашае маскоўскіх рэжысёраў М. І. Піжову і Бібікава.

Рэпертуар тэатра гэтага года разлічан, галоўным чынам, для дзяцей малодшага і сярэдняга ўзросту. Апрача вышэй пералічаных пастановак калектыў тэатра марыць у гэтым сезоне ажыццявіць спектакль аб юнацтве вялікага правадыра нашай партыі Владзіміра Ільіча. Над п'есай аб юнацтве Владзіміра Ільіча працуюць маладыя драматургі—Вержбіцкі і Гнаеўскі.

Новыя п'есы для тэатра пішуць беларускія пісьменнікі: А. Якімовіч, Янка Маўр, Е. Міровіч і малады паэт Х. Мальцінскі.

З старога рэпертуара тэатр пакажа ў гэтым сезоне «Даходнае месца» Остроўскага, «Гады выпрабаванняў» Е. Раймонд, «Блакітнае і ружовае» А. Бруштэйн і «Як гартавалася сталь» па Н. Остроўскаму у новым мастацкім афармленні і літаратурнай апрацоўцы і інсцэніроўцы М. Юдэлевіча.

Першы раз у гэтым сезоне тэатр мяркуе выехаць за межы Рэспублікі на Украіну. Абмен творчым вопытам з выдатнымі тэатрамі Украіны прынясе нашаму маладому калектыву вялікую карысць у далейшай творчай рабоце.

В. СТЭЛЬМАХ.

У ПАВІЛЬЁНЕ БРАТНЯЙ УКРАІНЫ

(Заметкі з выстаўкі)

Насупраць велічны фантан. Струмені вады высока падымаюцца ўгору, нахіляюцца ад ветру, і вадзяны веер на імгненне застывае. Праменні сонца пранізваюць гэты распылены парашутападобны веер. Ён павольна ападае ў напрамку павільёна, нібы ўказвае туды шлях.

Ад галоўнага павільёна праз усю плошчу калгасаў, а пазайздросціць ёй можа любая плошча гарадоў СССР, мы накіроўваемся ў павільён Украінскай ССР, ці, як проста гавораць на Усесаюзнай выстаўцы, «ідзем ва Украіну». Рэспубліка багатая і сонечная, прасторная і шчасная. Усё гэта ўвасоблена ў суровую і выразную скульптуру павільёна, які ўзвышаецца над зямлёй вялікім чатырохвугольнікам. Сцены павільёна — гэта стройныя шарэнгі калон, якія заканчваюцца бронзавымі калоссямі багатай ураджайнай пшаніцы, сімвалізуючы гэтым ураджайнасць пладаноснай совецкай украінскай зямлі.

Прыветліва і цёпла сустракае нас павільён братняй Украіны. Увагу наведвальнікаў прыкоўваюць да сябе дзве скульптурныя групы стаханаўцаў прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Работа мастакоў Беластоцкага, Піваварава і Фрыдмана добра тым, што яна манументальна і надзвычай выразна, поўна прастаты, жыццесцвярджальнасці і нейкай асаблівай веліччы. Фігуры лепшых людзей краіны прыўзнятай рукой запрашаюць зайсці ў павільён. І адразу мы ў чароўнай і квітнеючай Украіне. Багатае афармленне, уплывае сталь святла. На першым плане арнаментальны народны фон і ля яго вялікая скульптура таго, думкамі аб кім жыве ў гэтыя дні кожны экскурсант Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, скульптура вялікага Сталіна. Яна майстэрска зроблена, поўна выразнасці. На версе кавёр з надпісам: «Хай живе рідний Сталін»! Навокал экраны-экраны, на якіх дэманструюцца поспехі украінскага народа, паказваюцца партрэты знатных людзей навукі, тэхнікі, літаратуры, мастацтва.

Увесь зал вялікага павільёна ўпрыгожан. Яго апаясвае велізарны украінскі кілім размерам да 90 метраў, які выткан калгасніцамі—майстрамі народнай творчасці. Карычневы мрамар, якім абрамлён пакальны зал, і ўзоры народнай вышыўкі ствараюць стройную гамму цудоўнай прыгожасці. На сценах — залатымі літарамі начэрчаны артыкулы Сталінскай Канстытуцыі.

**
*

— А гэта воўна такая? — запытвае хтосьці ў экскурсавода.

— Не, гэта украінская бавоўна. Экскурсант задаволена зазначае пра сябе: «Бавоўны на Украіне не было—бавоўна цяпер ёсць»...

Стэнд за стэндам прыкоўваюць увагу. На іх буйныя каласы ўсіх сартоў пшаніцы, жыта, свежыя фрукты, гародніна, сакавіты вінаград, цудоўныя цукровыя буракі з радзімы Марыі Дземчэнка, дакументы перамог і рэкордаў. На мінутку мы прыпыняемся. На аздобленым бронзай стэндзе ілюстрыруецца на радзе яркіх прыкладаў заможнае калгаснае жыццё. Толькі за другую сталінскую пяцігодку грашовы даход калгасаў Украіны павялічыўся ў 3.9 раза, а даход калгаснікаў, які яны атрымліваюць на працадні,—у 6 разоў. Асаблівы росквіт заможнага жыцця дэманструецца на прыкладзе калгаса імені Леніна, Чамiравіцкага раёна, Камянец-Падольскай вобласці. На аснове прымянення сучаснай агратэхнікі калгас дасягнуў на плошчы ў 143 гектары за апошнія два годы ўраджай 429 цэнтнераў цукровых буракоў з гектара, 17.7 цэнтнера з гектара зерневых.

Цікавы фота-дакумент тут-жа ілюстрыруе новае калгаснае паселішча. Яно падобна на гарадскі пасёлак. Тут тэатр, клуб, бібліятэка, спартыўная пляцоўка, дзіцячыя яслі, хата-лабараторыя, радзільны дом, лазня і рад іншых прыгожых па архітэктурнай пабудове будынкаў.

— Такой стала новая ўкраінская вёска! Такім стала новае жыццё калгаснага сялянства без памешчыкаў і куркулёў.

Мастацка афармлен стэнд, прысвечаны поспехам калгаса «Памяці Леніна», Міхайлаўскага раёна, Запарожскай вобласці. Тут забываешся, што знаходзішся ў Маскве на выстаўцы. Яркае панно украінскіх мастакоў пераносіць цябе на поле, дзе ў самым разгары праходзіць уборка ўраджаю камбайнамі. Стэнд багат доказамі культуры працы ў гэтым калгасе, доказамі вялікай адданасці калгаснікаў соцыялістычнаму ладу.

Нарэшце, мы ля стэнда, на якім адлюстраваны поспехі трох ордэнаносных калгасаў Украіны. Усе яны дабіліся вялікіх поспехаў, заваявалі небывалыя рэкорды выпрацоўкі, набылі сусветную славу.

Спыняюцца экскурсанты і падоўгу гутараць ля стэнда. Некаторыя гатовы накпіць над Польшчай, Францыяй і Італіяй. І сапраўды, адна Совецкая Украіна вырабляе цукровых буракоў больш, чым гэтыя тры дзяржавы, разам узятыя. Хочацца сказаць, стоячы ля гэтага стэнда—слава нашым калгаснікам, дасягнуўшым такога высокага ўраджаю!

Побач-жа стэнд, які пераканаўча расказвае аб рэкордных ураджаях, якіх дасягнулі калгасы Совецкай Украіны за апошнія годы. Ад 400 да тысячы цэнтнераў буракоў з га — вось вынік плённай працы многіх калгасаў і нават раёнаў рэспублікі. На фота—лепшыя стаханаўцы—буракаводы, майстры вялікіх ураджаяў.

**
*

Сад... Поўна фруктаў, гародніны. Гэта правы зал павільёна Украінскай ССР. Экскурсанты праходзяць ля налітых сокам ігруш, спелых чырвонашчокіх яблык, вішань, ля карзін поўнасочных памідораў, арбузаў, ля галінак ураджайнага вінаграда. Усё так зроблена, што здаецца знаходзішся не ў павільёне, а дзесьці там, у сонечнай Одэсе, на беразе Чорнага мора.

У гэтым-жа зале, па майстэрску афармленым украінскімі мастакамі, дэманструюцца поспехі Совецкай Украіны ў галіне жывёлагадоўлі. Глядзіш і радуешся, як клапатліва і дбайна гадуюць добрых коней, кароў, свіней калгаснікі і калгасніцы Украіны.

Кожны стэнд апавядае аб цудах. На адным з іх яркія фота кароў-рэкардыстак, на другім — коней-бягуноў, на трэцім—радыёфіцыраваныя фермы, фота лепшых стаханаўцаў жывёлагадоўлі.

Пісаць аб усім, што тут прадстаўлена, можна цэлыя кнігі. Ясна адно, што УССР, як і ўсе братнія рэспублікі вялікага Совецкага Саюза, ператварылася ў магутную краіну, несакрушальнасць якой відавочна. Ясна адно, што ленінска-сталінская нацыянальная палітыка нашай партыі дэманструе на выстаўцы яшчэ раз свае выдатныя плады.

Павільён — згустак багацця і прыгажосці. Яго штодзённа наведваюць тысячы экскурсантаў і радуюцца поспехам Совецкай Украіны. Кожны з наведвальнікаў пакідае ў сабе найлепшыя пачуцці задаволенасці і радасці. Многія наведваюць павільён двойчы. Вось экскурсант з Уфы Г. Цветкоў у кнізе водзываў піша:

«Другі раз аглядаў павільён, другі раз застаўся задаволеным. Надоўга захаваю памяць аб выдатным павільёне багатай і культурнай Украіны».

З брацкай цеплынёй і любоўю аглядаюць павільён калгаснікі нашай рэспублікі. Яны бясконца рады поспехам братняй Украіны, якая спаборнічае з нашай рэспублікай на лепшую барацьбу за новыя поспехі сельскай соцыялістычнай гаспадаркі. Лепшы вопыт яны імкнуцца пераняць. Тут неаднаразова можна бачыць старшынь калгасаў, брыгадзіраў, калгаснікаў БССР, турбуючых кансультантаў і запісваючых усемагчымыя весткі. Адна з груп калгаснікаў БССР пакінула аб павільёне водзыў:

«Цяжка перадаць тое ўражанне, якое зрабіў на нас грандыёзны паказ росквіту і дасягненняў братняй УССР. Усе гэтыя поспехі сталі магчымымі толькі дзякуючы совецкай уладзе, дзякуючы мудраму кіраўніцтву ВКП(б) і мудрага нашага настаўніка і правадыра таварыша Сталіна. Удзельнікі групы экскурсантаў-калгаснікаў Капыльскага раёна, Мінскай вобласці, перапоўнены гордасцю і радасцю за поспехі брацкага народа».

Такіх лаканічных запісаў дзесяткі. Яны простыя і пераканаўчыя. У брацкім садружастве з усімі народамі Совецкага Саюза калгаснікі нашай і Украінскай рэспублік даб'юцца яшчэ нямала цудоўных поспехаў, заваююць яшчэ большыя ўраджаі, рэкорды, якіх не ведаюць капіталістычныя краіны ні ў адной галіне сваёй сельскай гаспадаркі. З такой думкай пакідае кожны наведвальнік павільён Совецкай Украіны на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Пав. КАВАЛЁЎ.

Гор. Масква.

У ЦЫРКУ

(Да закрыцця сезона)

Совецкае цыркавое мастацтва, развіваючыся з кожным годам, у паасобных сваіх нумарах стала выканаўча дасканалым, але побач з гэтым у цыркавых праграмах скрозь і ўсюды трапляюцца звычайныя «антрэ» — альбо зусім шэрыя, альбо завуаліраваныя «бляскам» выхаду і афармлення.

Калі ўзяць летнюю праграму Мінскага дзяржцырка ў цэлым, дык можна адзначыць, што яна была ўпаўне задавальваючай гледача, не працяглай у цыклах і дастаткова разнастайнай. Разам з тым налёт халтурнасці і «абавязковага» «ассорці» наглядаўся і ў гэтым годзе.

Дагестанскія канатаходцы Цоўкро, кітайскі атракцыён Ван-ю-Лі, Барыс Эдэр з ільвамі, безумоўна, з'яўляюцца нумарамі вялікага плана, на якіх устойліва трымаўся мінскі цыркавы сезон пры лавышанай зацікаўленасці гледача.

Пры асаблівай зацікаўленасці гледача праходзілі маладыя жыццёрадасныя Цоўкро і гэта ўпаўне заслужана, бо пастаноўка атракцыёна патрабавала ад тэмпераментных і спрытных дагестанцаў вялікай і ўпартай працы. Іх выступленне было свежым, непасрэдным і падкупляючым.

Артысты Гарвей (паветраны акт) — бясспрэчна здольныя цыркачы, але яны зніжаюць свой поспех замаруджаннем тэмпаў у рабоце.

Нічым не вылучаецца выступленне Гаўрылавых (крафт-акрабаты) і Шчукіна (антыпод). Гэта — шэрая правінцыяльная цыркаўшчына, роўна як і конны вальцiж маладога Нікіціна, які не ідзе далей добрай вальціжыроўкі чырвонаармейца-кавалерыста першага года службы.

Калі работа на манежы дрэсіроўшчыка коней Нікіціна задаволіла гледачоў, дык нельга даходзіць да ўзвядзення ў «адзіны» і «манапольны акт» нумар «смяючыйся конь» — паказваць гэта гледачу —пошласць, такі «акт» можна выклікаць у любога мерына ў калгасным табуне. (Да чаго-ж можна дайсці?).

Да добрых нумароў змешаных праграм за сезон трэба, бясспрэчна, аднесці: акрабатаў Доніна і Смародкіна, снайпераў Рынглер, эксцэнтрыкаў-акрабатаў Пятроўскіх, Міраслаўскіх («стальныя капітаны»). Выдатна работа Косарэва (сальтомартале на кані) і Спарры (жангляж).

Ідэя стварэння самастойных мастацкіх цыркавых труп нядрэнная, але ў трупе № 5 ёсць многа рэпертуарна-выканаўчых недахопаў. Возьмем, хаця-б музыкальна-балетны пралог — выхад усіх удзельнікаў праграмы. У ім мала мастацкага афармлення, зладжанай музыкі і арыгінальнасці. Выступленне «доктара медыцыны» перад публікай пошлае і непрадуманае. Што добрага ва ўсім пралогу, дык гэта тэкст песні Лебедзева-Кумача. Не з'яўляецца выдатнай і музыкальная эксцэнтрыяда артыстаў Герні, пошла і дзіка гучыць так-называемы цыркавы скетч «лялька на чайніку» (арт. Драздова і Стукалкін). Здзіўляешся, як такая дзікая халтура прапушчана на арэну. Малакроўна і не гучыць па-цыркавому сатыра Праўдзінай і Вольнага, гэта пасрэдны эстрадны нумар. І толькі «Лясная ідылія», «дрэсіраваныя мядзведзі» жанглёры Гуравы, Нікольс і Германаў, Мінасаў і Озераў (акрабатыка) заслугоўваюць увагі.

Трупа Паўлавых, бясспрэчна, «гвоздзь» усёй праграмы пятай цыркавой брыгады. Вялікае іх выступленне — прадуманае ад выканання да афармлення і маючае ў гледача вялікі поспех.

Клоун Георгій Васільевіч Стукалкін у сваім жанры надзвычай цікавы і арыгінальны, нават больш таго, неперайм альны. Мае сваю манеру, але не ўзброен у дастатковай ступені моўным матэрыялам. Але нават і пры гэтым недахопе заваёўвае аўтарытэт буйнага клоуна.

На вялікі жаль, выступленне пятай брыгады заканчвае канюшня Нікіціна, прыехаўшая з вясны.

Арганізацыя праграм не залежыць ад дырэкцыі Мінскага дзяржцырка, але ўсё-ж тт. Кабішчэру і Стукалкіну трэба больш прад'яўляць прэтэнзій Маскве на якасць высылаемых у Мінск труп і асобных нумароў.

В. МУРАТ.

ТВОРЧАЯ ЎДАЧА

„ПАРТЫЗАНЫ" К. Крапівы ў Заслаўльскім калгасна-соўгасным тэатры

У калгасах і соўгасах Беларусі гэты спектакль Заслаўльскага калгасна-соўгаснага тэатра ішоў ужо больш 100 разоў. У вечар 28 жніўня ён ішоў далёка ў незвычайнай абстаноўцы. Гэта быў спектакль на першым Усесаюзным фестывалі калгасна-соўгасных тэатраў у Маскве. Пачэснае права выступлення перад грамадскасцю сталіцы Заслаўльскі тэатр заваяваў велізарнай работай па абслугоўванню працоўных беларускай калгаснай вёскі, вялікімі мастацка-творчымі намаганнямі. І гэту пачэсную задачу тэатр выканаў з гонарам. Ён паказаў спектакль, які стаў побач з лепшымі спектаклямі фестываля.

Рыхтуючыся да паездкі ў Маскву, тэатр прарабіў над спектаклем вялікую работу. У асноўным гэта работа ішла па шляху паглыблення і распрацоўкі акторамі сваіх ролей, у падняцці культуры спектакля. Галоўная вартасць спектакля—гэта ансамблевасць акторскага выканання і вялікая культура рэжысуры. Калектыву ўдалося дабіцца такіх суадносін выканання, пры якіх ні адзін выканаўца не ўрываўся дысанансам. Рэжысура растварылася ў акторскім выкананні.

Перамагаючы цяжкасці драматургічнага матэрыяла, пастаноўшчыкі П. А. Данілаў і Ю. Г. Палічыненкі ўмела і тонка карысталіся ўсімі моцнымі і ўдалымі месцамі п'есы Крапівы, затушоўваючы слабыя яе бакі. Сцэна чакання вестак аб абмене заложнікамі, расправа Ендрыхоўскіх з сялянамі, сцэна падпольнага сходу пад выглядам сватаўства зроблены па-майстэрску. Буйнай заслугай рэжысуры з'яўляецца таксама стварэнне сцэнічнай ілюзіі вялікіх народных падзей, масавых сцэн з надзвычай вялікай колькасцю выканаўцаў. Гэта дасягаецца тым, што большасць масавых сцэн будуецца з прадзельнай выразнасцю і скульптурнасцю агульнага рысунка мізансцэн, насычанасцю мыслямі паводзін кожнага ўдзельніка, прадуманасцю поз, жэстаў, рухаў кожнага з іх.

Сцэна атрымання вестак аб спазненні пісьма аб абмене заложнікамі. Выходзіць «сарока», натоўп кідаецца да Батуры. Звычайна жартаўнік і весяльчак, Батура прыгнечан. Ён расказвае аб спазненні пісьма Дрыля з прапановай абмена палонных. «Расстралялі!» «Што?»—вырываецца ў натоўпе. Моладзь павольна адышла, на месцы ля бярозы засталася маўклівая журботная група, якая стаіць спіной да гледача — сястра ці дачка аднаго з расстраленых і двое, якія падтрымліваюць яе. Гэта проста, моцна, хвалююча.

Рэжысура насычае спектакль народнымі песнямі, танцамі. Цудоўна падабраныя і дасканала пастаўленыя хоры і танцы (кампазітар Сакалоўскі, балетмайстар Даронін) у большасці выпадкаў арганічна ўплятаюцца ў тканіну спектакля, робячы яго квяцістым, сакавітым, лёгка ўспрымаемым. Асабліва добрыя сцэны песень і плясак у партызанскім лагеры. І песня «Ехалі маршалы», і танец, поўны народнага гумару, добрага густу, і, што асабліва важна, пляска партызан не сумбурная, а прасякнута простай чоткай думкай.

Аднак там-сям адчуваецца перагрузка песенным матэрыялам, некаторыя доўгаты, так, напрыклад, вельмі шмат песень у сцэне сватання, вельмі многа частушак у пятай карціне.

Найбольшай акторскай удачай у спектаклі я лічу выкананне ролі дзеда Бадыля маладым актёрам Г. І. Шыкаўцом. Умелае адшукванне характэрнасці вобраза, пачуццё мастацкай меры, насычанасць вобраза цеплынёй вылучае маладога актора. З першага з'яўлення дзед Бадыль прыцягвае ўвагу і выклікае сімпатыі гледачоў. Вобраз Бадыля бадай найбольшая ўдача і ў аўтара К. Крапівы. Народная мудрасць, прастата, чоткасць светапогляду, упартасць у барацьбе за правы народа з найбольшай сілай гучаць у п'есе не ў агітацыі Скібы, а іменна ў скупых рэпліках дзеда Бадыля, у развіцці яго драматургічнай характарыстыкі. Актор і рэжысура ясна ўсведамлялі гэта. Размова Бадыля з памешчыцай аб зямлі па-акторску выдатная. З велізарнай пераканаўчасцю і прастатой гучыць адказ дзеда памешчыцы: «Тваю зямлю араў, бо сваёй не меў» і мудрае сцверджанне, што зямля не павінна пуставаць, яна павінна хлеб радзіць. У сцэне «сватання» акторам таксама знойдзена цікавая і тонкая лінія раскрыцця вобраза: насцярожанасць дзеда з няпрошанымі гасцямі, апасенне правакацыі і пераход да шчырасці вырашаны акторам тонка і верна. Сцэнка выпівання Бадылём чаркі, паднесенай Скібай, з наступнай просьбай «дай чым душу заткнуць» зроблена цудоўна.

«Не пазналі сваіх пашы, бярозавай далі кашы» — кідае весяльчак і гарманіст Батура (артыст А. А. Ефрэменка) у адказ на запытанне кулака Маргуна аб прычынах яго адмаўлення сустракаць інтэрвентаў-палякаў і многазначна дадае: «Ага!» У гэтым «ага» актор дае нібы ключ да далейшага раскрыцця ролі. Тут і гарэзная насмешка, і пераканане ў правільнасці сваіх паводзін, і ноткі здзекавання над Маргуном. Заўсёды з гармонікам і бойкай песняй Батура — вясковы пячкур, выхадзец з горада, паляк па нацыянальнасці, свой чалавек сярод вясковай беднаты, моладзі, у партызанскім лагеры. І ўсюды, дзе ён паяўляецца, гучыць смех, пачынаюцца песні, пляскі. Актор не валодае «оперным» голасам, але тым не менш глядач з велізарнай прыемнасцю слухае ў яго выкананні і народную песню «Дубрава», і дасціпную «З Кракава, з Варшавы», і бойкія частушкі. Ён выконвае песні з тонкай нюансіроўкай тэкста.

Перад акторам Н. П. Ефрэмавым стаяла цяжкая задача — трэба было перамагчы хадульнасць станоўчага персанажа — большэвіка Скібы. Актор справіўся з гэтай задачай. Ён знайшоў прастату тона, здолеў не толькі па сітуацыі, але і па сутнасці паставіць Скібу ў цэнтр увагі гледача, прымусіць гледача адчуць сімпатыю не толькі да слоў Скібы, але і да яго самога. Актор перамагае хадульнасць унутраным напаўненнем выконваемага вобраза і распрацоўкай дэталей. Гутарка з Маргуном аб вінтоўцы простадушная — тут трэба іменна гэта. Паводзіны Скібы ў сцэне сватання ўжо цэлая гамма тонкіх, дасціпных акторскіх прыёмаў. Вобраз робіцца разнабаковым, цікавым.

Данілу Дрыля іграе актор І. І. Купэвіч. Правільнае вырашэнне ролі ў цэлым, спалучэнне з добрымі знешнімі данымі актора робяць вобраз праўдзівым. Глядач верыць, што за Данілам вясковая бедната і серадняцтва пойдзе, пойдзе ўпэўнена, без хістанняў. У ролі побач з удалымі месцамі ёсць пераігрыванні. Так, напрыклад, у сцэне клятвы над целам забітага Антона актор некалькі «націскае». Гэта вядзе да нагнятання песімізма, да нявернага вырашэння не толькі кавалка ролі, але і ўсёй сцэны.

Рыгор у выкананні І. Я. Кір'янава — адна з лепшых акторскіх ролей. Прастата тона, з якой праводзяцца самыя адказныя месцы п'есы, і ў прыватнасці, мацнейшая драматургічная шостая карціна (сцэна замаха на жыццё Дрыля), эканомнасць выразіцельных сродкаў, вялікая эмацыянальная насычанасць выканання—усё гэта захапляе гледача і прымушае яго хваляванца за лёс героя. Актор пры дапамозе рэжысуры прарабіў вялікую работу па зняццю штампаў, фальшывячай меладраматычнасці, якая была ў яго ранейшым выкананні.

У невялікай ролі Халімона актор А. І. Гвоздзеў стварыў каларытны запамінаючыйся вобраз. Гаспадарлівасць Халімона у сцэне чакання інтэрвентаў, яго дзелавітая прастата ў адносінах да пана Ендрыхоўскай паказваецца акторам сакавіта, з добрым тонкім гумарам. Цікава выкананне і адмоўных вобразаў п'есы. Перш за ўсё гэта датычыць да раскрыцця ролі кулака Маргуна С. І. Яворскім. Цікавая тонкая інтанацыйная расфарбоўка тэкста, дасканала знойдзеная знешняя характэрнасць, уменне стварыць вобраз не штампаванымі прыёмамі, а глыбокім унутраным раскрыццём лініі сцэнічных паводзін робяць выкананне Яворскага цікавым і значным. Знешнія даныя акторкі К. Г. Захарэвіч, якая выконвае ролю Капрыны, не адпавядаюць матэрыялу ролі, але тое, што робіцца астатнімі акторскімі сродкамі, цікава, часам захапляюча і ўсюды праўдзіва.

Асабіста мяне глыбока нездавальняе ў спектаклі яго афармленне. Калі вырашэнне інтэр'ера (хата Бадыля і хата Рыгора) здавальняючыя, то экстэр'еры проста-такі няўдалыя, асабліва сад Ендрыхоўскіх. Мастакам І. М. Ушакову і А. І. Багданаву проста здраджвае добры густ. Няверны самы прынцып афармлення нагрмаджэннем дэталей, безгустоўнымі падугамі з разбіўкай на планы. Тое, што добра на вялікай опернай сцэне пры ўмовах максімальнага выкарыстання светлавых сродкаў, для калгаснага тэатра не падыходзіць. Мастакам трэба было ісці па шляху стварэння афармлення, у якім рашаючую ролю адыгрывала-б дэталь, частка ад цэлага.

Спектакль «Партызаны» ў Заслаўльскім тэатры з прадзельнай пераканаўчасцю сведчыць, што калгасныя тэатры, закліканыя абслугоўваць найшырэйшыя слаі працоўных у нашай новай совецкай вёсцы, могуць стварыць і ствараюць сапраўдныя мастацкія вартасці — спектаклі хвалюючыя, цікавыя, яркія.

Ант. СЕГЕДЗІ.

ПАВЕЛ СЦЯПАНАВІЧ МАЛЧАНАЎ

Імя заслужанага артыста рэспублікі П. С. Малчанава, выдатна сыграўшага ролю В. І. Леніна ў спектаклі «Чалавек з ружжом» (Другі дзяржаўны драматычны тэатр) вядома шырокім колам совецкага гледача БССР.

Калі ўяўляеш сабе творчае аблічча Малчанава, успамінаецца пісьмо К. С. Станіслаўскага да юбілея В. І. Качалава, у якім геніяльны майстар сцэны пісаў, што надзвычайна каштоўная ўласцівасць актора—яго вялікае прыроднае абаянне. Абаянне і глыбокая праніклівая мысль—уласцівасці многіх сцэнічных стварэнняў Малчанава.

Малчанава мы бачылі ў ролях рознага плана і дыяпазона. Ён сыграў пагодзінскага Косцю-капітана, тупога і ўнутрана апустошанага паліцэйскага—Шышлу, дасціпнага і вясёлага партызана Дарвідошку, белагвардзейскага паручыка Яравога, следчага Ларцава, наіўна-першабытнага і падзізычаму даверлівага птушніка Перчыхіна.

У кожнай новай п'есе Малчанаў шукае галоўную творчую ідэю аўтара і ў выніку знойдзенага, вызначае шляхі сцэнічнага ўвасаблення вобраза.

Вельмі часта актор узбагачае літаратурны вобраз новымі цікавымі сцэнічнымі дэталямі. Аб гэтым піша і народны паэт рэспублікі Якуб Колас: «Артыст П. Малчанаў,—гаворыць Колас, — выконваючы ролю Дарвідошкі... пайшоў далей задуманага мной вобраза. Ён дапаўняе яго характарыстыку, шукае сваіх рысачак для паглыблення гэтага вобраза».

Да работы над вобразам Малчанаў падыходзіць як вучань і гарачы прыхільнік школы Маскоўскага Мастацкага тэатра. Малчанаў—паручык Яравы — па свайму сцэнічнаму стылю многім нагадвае вобразы белагвардзейскіх афіцэраў з Мхатаўскага спектакля «Дні Турбіных». Артыст далёкі ад таго, каб паказваць белагвардзейца ў плане голай тэндэнцыйнасці, «з абразам у руках». Ён шукае унутраную лінію руху думак і пачуццяў вобраза. Яравой—Малчанаў разыгрывае камедыю «шчырага» кахання да жонкі з адной мэтай—абманушы яе пільнасць, скарыстаць інтымныя пачуцці любячай яго жанчыны для сваіх здрадніцкіх дзеянняў.

У каларытнай постаці Яравога Малчанаў даносіць мысль аб асуджанасці той справы, за якую марна змагаюцца Яравыя і ім падобныя контррэволюцыйныя «дзеячы». Патрасаючая ігра артыста запальвае ў гледача пачуцці нянавісці да заклятых ворагаў народа.

Горкаўскі птушнік Перчыхін патрабуе іншых шляхоў мастацкага ўвасаблення, больш мяккіх і лагодных сцэнічных фарбаў. Малчанаў у ролі Перчыхіна раскрывае перад гледачом вобраз «паэта ў душы», закаханага ў прыроду, гатовага ўсё жыццё блукаць па лясах і адчуваць асалоду птушынага жыцця. Артыст паказвае чалавечае аблічча Перчыхіна, яго нелюбоў да грошай, да крывадушных мяшчан, простую і незабыўную натуру птушніка, яго палкае пачуццё справядлівасці — бяскрыўднасць гэтага чалавека.

Артыст пазбег небяспекі паказу Перчыхіна свядомым пратэстантам супроць бессеменаўшчыны. Ён правільна падкрэсліў наіўнае здзіўленне, разгубленасць, бездапаможнасць птушніка перад канфліктам прадстаўнікоў двух розных светапоглядаў Бессеменава і Ніла.

Самай вялікай удачы Малчанаў дасягнуў у сваёй рабоце над роллю геніяльнага правадыра чалавецтва В. І. Леніна. Бясконца шчаслівы аказаным яму высокім давер'ем, артыст мабілізаваў увесь свой талент, усё сваё ўмельства на сцэнічнае ўвасабленне любімага вобраза Ільіча. Малчанаў імкнуўся паказаць арганічную злітнасць унутранага і знешняга аблічча правадыра. Як чулы і ўдумлівы мастак, артыст здолеў перадаць пачуцці і перажыванні Ільіча, інтанацыю ленінскай гутаркі, манеру жэста і хады, амаль партрэтнае падабенства з Ільічом.

Малчанаў здолеў сцэнічна ўвасобіць многія тыповыя рысы ўнутранага аблічча правадыра — цвёрдасць і непахіснасць волі, чалавечую прастату і сувязь з народам, глыбокі і ясны розум, бацькоўскую любоў да працоўных і нянавісць да ворагаў, рэволюцыйнае гарэнне і большэвіцкую мэтаімкнёнасць.

У карыдоры Смольнага Ленін сустракае акопніка Івана Шадрына. Малчанаў паказаў, як ветлівай усмешкай, шчырай і простай таварыскай гутаркай, Ленін хутка устанавіў душэўны кантакт з «чалавекам з ружжом». Сэрца Шадрына напоўнілася радасцю і незвычайнай цеплынёй да Ільіча. Шадрын паведаў Леніну ўсе свае глыбока захаваныя душэўныя таямніцы і салдацкія думы.

Прыёмная Смольнага. Ленін заканчвае гнеўную прамову супроць здраднікаў рэволюцыі, а ў гэты час яго выклікаюць да тэлефона для гутаркі са Сталіным. Малчанаў паказвае, як пад уплывам гутаркі з таварышом Сталіным гнеўны, нервова ўзбуджаны настрой Ільіча змяняецца спакоем і задавальненнем ад яснага і пераканаўчага даклада Сталіна.

Вельмі разумна, з мастацкім густам, артыст падкрэслівае саркастычны тон гутаркі Леніна з меншавіцкімі «дзеячамі», якія з'явіліся ў Смольны.

Малчанаў здолеў раскрыць эмацыянальны падтэкст задушэўнай, з адценнем мяккага гумару, гутаркі Леніна з камісарам па паліву. У гэтай сцэне артыст паказаў вялікае ўмельства Леніна ўздымаць ініцыятыву пралетарскіх мас, упершыню ў гісторыі прышоўшых да кіраўніцтва дзяржавай. Аблічча Леніна — правадыра і настаўніка мас—паказвае Малчанаў і ў сцэне гутаркі Ільіча з прадстаўніком фронта аб транспарце *для дастаўкі снарадаў*.

У габінеце Смольнага Малчанаў паказвае кіпучую і невычэрпную энергію Леніна, яго ўвагу да дробязей.

Таленавіты артыст П. С. Малчанаў павінен не заспакойвацца дасягнутым у рабоце над вобразам Леніна. Многастайнасць і велічнасць вобраза геніяльнага правадыра—невычэрпная крыніца далейшага натхнення артыста для яшчэ больш паглыбленай работы над раскрыццём вобраза.

Сваім яркім мастацтвам П. С. Малчанаў даставіць яшчэ многа радасці нашаму гледачу.

М. МОДЭЛЬ.



Кадр з фільма «Великий гражданин» (II серыя). Заслужаны артыст рэспублікі ордэнаносец **А. Заржэўскі** ў ролі Дубка і артыстка-ордэнаносец **З. Фёдарава** ў ролі Надзі Калеснікавай.

„БРАТ ГЕРОЯ" ЛЬВА КАСІЛЯ

(Да пастаноўкі ў Тэатры юнага гледача БССР імя Н. К. Крупскай).

Адбылося наступнае: у пяты клас Северанскай школы паступіў хлопчык Геша Чэрмыш, аднафамілец героя Совецкага Саюза маёра Кліменція Чэрмыша.

У рэбят, якія дружалюбна сустрэлі навічка, натуральна ўзнікла пытанне— ці не з'яўляецца родзічам хлопчыку славуты Чэрмыш.

Аказалася, што Гешка і Кліменцій — родныя браты. Аб гэтым усяму класу ў прысутнасці настаўніцы геаграфіі Еўдакіі Власаўны сказаў Гешка Чэрмыш. І ў пацверджанне паказаў адрасаванае яму пісьмо, на канверце якога стаяў адваротны адрас: Масква. Авіягарадок. Кл. Чэрмыш.

Хлопчык і вонкавым абліччам сваім чымсьці нагадваў славутага лётчыка. На каўнеры кашулі яго былі нашыты блакітныя пятлічкі. На рукаву—лётны значок. Апрача ўсяго, ён здзівіў школьнікаў сваімі ведамі ў складаных пытаннях самалётаваджэння, цытыруючы напамяць выказванні Ассена Джарданава, аўтара класічнай кнігі «Вашы крыллі».

Дзецям яўна імпаніравала дружба з братам героя. Асабліва ў дні, калі кандыдатам у Вярхоўны Совет Саюза ССР працоўнымі Северанска быў выстаўлен Кліменцій Чэрмыш — бясстрашны пілот, які зрабіў велізарны беспасадачны пералёт па маршруту Севастопаль — Чукотка.

Але Гешка схлусіў. Маёр аказаўся толькі аднафамільцам. У гэтым Геша сам прызнаўся сваёй сяброўцы Анне Баратавай.

У Северанск прыляцеў Кліменцій Чэрмыш. У разультате цэлага рада прыгод адбылася сустрэча Гешкі з Кліменціем.

У прысутнасці сваіх таварышоў, педагогаў і лётчыка хлопчык растлумачыў усё.

Адрасат на канверце быў правільны. Пісьмо прыслала Гешку яго сястра Клаўдзія, якая жыве на тэрыторыі авіягарадка ў Маскве. Гешка Чэрмыш выдумаў сабе братам героя Совецкага Саюза, але не толькі таму, што Кліменцій Чэрмыш вядомы і прыемна мець славутага брата, але і таму (і гэта самае галоўнае), што ён хоча ва ўсім быць падобным на Кліменція, пераймаць у яго і трэніраваць сваю сявдомасць, волю і цела на тое, каб быць здольным рабіць подвігі, якія робяць героі Совецкага Саюза.

Прыход Касіля ў драматургію дзіцячага тэатра здаецца нам упаўне законамерным. Аўтар прынёс у тэатр сваё добрае веданне псіхікі совецкага дзіцяці, якога цікавіць рашуча ўсё і які хоча ведаць увесь свет у мінулым, сучасным і будучым.

Касіль — вялікі выдумшчык. У яго шмат рамантычнага ваабражэння, запейлівасці, здольнасці іграць узурбён..., іменна тых уласцівасцей, якія так неабходны ўсякаму мастаку, які стварае творы для юнацтва.

П'еса яго займальная. У ёй шмат вострых і яркіх сцэнічных палажэнняў. Яна напісана ў манеры лірычнага фельетона, выдатным майстрам якога з'яўляецца Касіль. У ёй шмат мяккага, ледзь-ледзь іранічнага, але добрадушнага гумару. Памайстэрску выпісаны вобразы дзяцей. У першую чаргу вобраз Гешкі, у якім адчуваецца складаны, яшчэ несфарміраваўшыйся, але надзвычай цікавы характар.

Тэатр з захапленнем працуе над першай у сваім рэпертуары п'есай аб совецкай школе. Музыку на гэты спектакль напісаў кампазітар Л. А. Лукас, мастак-кансультант А. І. Донцава, балетмайстар Ф. Пінно.

У садружастве з маладым, здольным акторскім калектывам, кіруемым старэйшым майстрам беларускага тэатра засл. арт. БССР Е. А Міровічам, рэжысура справіцца з задачай максімальнага раскрыцця ідэі п'есы, сцвярджаючы тэатральны пачатак, закладзены ў ёй.

Пастаноўшчык спектакля рэжысёр
З. М. ЕРУХІМОВІЧ.

Ад камісіі па ўшанаванню памяці Э. Л. Самуйлёнка

Камісія па ўшанаванню памяці Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка звяртаецца з просьбай да ўсіх таварышаў, у якіх ёсць рукапісы, пісьмы і фатаграфіі пісьменніка, прыслаць арыгіналы або копіі гэтых матэрыялаў па адрасу: Мінск, Совецкая 76, Камісіі па ўшанаванню памяці Эдуарда Самуйлёнка.

ХРОНІКА

⊙ За штодзённую дапамогу Кіеўскаму дзяржаўнаму украінскаму тэатру імя Ів. Франка і паспяховае правядзенне гастролей гэтага тэатра Упраўленне па справах мастацтваў абвясціла падзяку і прэміравала каштоўным падарункам дырэктара гомельскага клуба імя Леніна тав. Цукермана. Галоўны бухгалтар клуба тав. Хейфец прэміраван месячным акладам.

⊙ 15 верасня пачынаюцца заняткі на курсах па павышэнню кваліфікацыі маладых мастакоў.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Праўленне, партыйная арганізацыя, мясцком Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўленне па ахове аўтарскіх правоў з вялікім жалем паведамляюць аб заўчаснай смерці пасля цяжкай хваробы работніка Упраўлення па ахове аўтарскіх правоў, старшыні мясцкома ССПБ — БАРЫСА АБРАМАВІЧА БАРЫСАВА і выказваюць спачуванне яго сям'і.

П. Левановіч

Галубы

Апавяданне

Адной чэрвеньскай раніцай Міколка пачуў стрэл на двары суседа. Хлопчык здзіўлена выскачыў з хаты, хутка перамахнуў праз плот і, врыпаўшы да сцяны, пачаў выглядаць, хто-б гэта мог страляць. Сярод струхлелай саломы, перавалішы галаву праз аглоблю каламажкі, ляжала акрываўленая жанчына. У каламажцы Міколка заўважыў звязаную суседаву дачку. Ён жахнуўся, выскачыў з сваёй засады і атарапела кінуўся на суседскі двор.

— Ганка, Ганка, — крыкнуў ён над вухам звязанай дзяўчынкі і міжволі нахіліўся над старой... Галава з разтрапанымі валасамі, здаецца, была жывой, толькі вочы былі вялікія і страшэнныя. Міколка ўзяў галаву на рукі і голасна назваў старую:

— Цётка, а цётка... Хто вас?... Цётка-а-а...

Дзікі спалох кальнуў хлопчыка... Жанчына маўчала. Яна была мёртвай. Кроў рубінам запяклася на твары і пачарнела.

— Ой, мама-а! — закрычаў хлопчык і кінуўся ўцякаць з двара.

— Эй, жэўжык! — пачуў ён ззаду.

Міколка спыніўся. Ад хаты падыходзіў статны, невялікі ростам чалавек.

— Чый, хлопча, будзеш? — спытаўся ён.

— Суседаў...

— Вось малайчына ты ў мяне. А дзе ж твой бацька? Ты бацьку маеш?

— Маю, — адказаў Міколка, баязліва паглядаючы на чалавека.

— Ну, і дзе-ж ён жыве, твой бацька? Можа ён у партызаны пайшоў?

Хлопчыку стала страшна. Ён не ведае, што адказваць. Бацька даўно партызан, і ў вёсцы ёсць атрад партызанаў, але як пра іх гаварыць яму? Можа прызнацца?

— Ну, вось табе цукерка, хлопча, — Броніх, ці як цябе зваць... Вазьмі, ды скажы, дзе-ж бацька?

Хлопчык павёў вачыма на мёртвую жанчыну, потым на чалавека і здагадаўся, што гэта ён застрэліў. Бацька і брат Ганкі — партызаны і пэўна-ж данёс на іх хто-небудзь, вось і прыехалі дапрашваць... Потым хлопчык глянуў на руку з цукеркай і здрыгануўся.

— Ну, што-ж ты?..

— Бацька, — упомніў хлопчык, — там, у лесе...

Падышлі яшчэ два чалавекі ў вайсковых форменных куртках і прыслухаліся.

— ...Але я не ведаю, дзе яны стаяць... Даўно там быў, — пасмялеўшы, прамовіў Міколка.

Прышоўшыя пагаварылі паміж сабою, і той, што дапрашваў, ласкава сказаў:

— Бяры цукерку, ды збегай у лес, даведайся, дзе яны.

Ну, цяпер Міколка канчаткова зрадзіў Ганчынаму бацьку... А што маці скажа, калі дачуецца пра свайго Міколку. Ён стаў забойцам, можа, яшчэ горшым за польскіх жаўнераў. Нехацю хлопчык пайшоў з двара на вуліцу. Па вуліцы праехалі польскія коннікі. Жаўнеры правялі Міколку за вёску, дзе стаяла іх варта, і пачалі штосьці гаварыць па-свойму. Паглядзеў Міколка на вёску, на сваю хату, дзе засталіся адны яго любімыя галубы, і шкада яму стала чагосьці. Маці яго яшчэ досвіткам панесла бацьку есці. Яна не ведае, што прышлі палякі. Ды і Ганка не ведала. Нечакана ўсё, як з неба, звалілася.

З вёскі даносіўся плач, скавытанне парасят, кудахтанне курэй. Міколка зноў паглядзеў назад. Старыя хаты асвятляла ранішняе сонца. Яно іскрылася на саламяных росных страхах, пераліваліся сотнямі вясёлак. Ночкай накрапваў цёплы дождж, таму і раніца такая свежая, прыгожая... З вёскі назіркам ішоў чалавек, апрануты па-тутэйшаму.

— Эге, я ведаю, хто гэта... Няўжо я не пабачыў сваіх галубоў?.. — думаў хлопчык.

Дарога не пыліла. Пакропленая дажджом, яна чарнела між ярынамі і за ўзгоркам гублялася ў лесе. Міколка ведаў, як патраніць да бацькі, ён толькі змыліў афіцэру, каб як-небудзь вырвацца ад іх.

Параўняўшыся з лесам, ён ступіў на сцяжынку і, агладаючыся, юркнуў у гушчар. Чалавек неадступна следаваў за ім. Вясеннія птушкі шчабяталі прывабна і весела. Недзе паблізу, убачыўшы чалавека, закрычала сарока. Хлопчык кінуўся бегчы. Яго твар хвасталі жыдкія галінкі арэшыны, сухое ламачча чаплялася за ногі і крывавіла іх. Міколка не адчуваў болю. Нябачаны страх паганяў яго. Ён спяшаўся. «Хутчэй, хутчэй!» — падказвала думка.

— Хто такі? — раздаўся голас.

— Міколка, — задыхаўшыся, сказаў хлопчык.

Вартавыя прывялі яго ў лагер. Міколкава маці стрэла сына словамі:

— Ці не палякі ў вёсцы?

— Палякі...

У лагеры Міколка расказаў партызанам, як ён прышоў на двор і як дапытвалі яго палякі.

— Памер-ла-а... Га-ды... — жаласліва ўскрыкнуў Ганчын бацька, даведаўшыся пра смерць жонкі.—Мужчынкі, пойдзем. Марынку маю забілі, і за што? За што?.. Ай-ай-ай...

— Што-ж рабіць? — спытаўся Міколкаў бацька. — Іх многа?

— Я ўсіх не бачыў.

Праз некалькі часу два партызаны прывялі ў лагер невядомага чалавека. Гэта быў польскі шпік. Прыціхлі галасы. Людзі, апусціўшы галовы, думалі, як быць. Нарэшце, нехта парушыў цішыню:

— Вось, братцы, чакаць няма чаго. Будзем чакаць, дык там, у вёсцы, усіх пераструляюць і паб'юць... Ты, Міколка, ідзі і як-небудзь дай знаць нам, калі яны пачнуць адпачываць: ну, вось, хоць-бы вехаць саломы пастаў на хаце, альбо галубоў узгані са страхі. А мы, хлопцы, хутка з імі...

— А калі спытаюцца, дзе наш атрад, скажы, што ты яго не знайшоў.

— Ну, і заб'юць хлопца... Мой ты саколік, — заплакала маці.

Бацька падышоў да Міколкі і ласкава сказаў:

— Праўды, сынок, не кажы. Як пойдуць палякі на адпачынак, — ты галубоў узгані з пуні. Мы ўбачым галубоў над вёскай.

— Добра, — адказаў Міколка і пайшоў ад шалаша.

Па лесе з Міколкам ішла маці, потым развіталася, крэпка пацалавала сына і доўга глядзела яму ўслед, пакуль маленькая постаць не схавалася за ўзгоркам. Міколка не ішоў, а бег у вёску. Ён хацеў хутчэй здабыць вестку пра палякаў.

Неўзабаве паказалася вёска. Міколку прапусцілі вартавыя і ён, забыўшыся на афіцэра, пайшоў гародамі прама да сваёй хаты. Прышоў у пуню. Спалоханыя галубы вылецелі з кошыка. Тады Міколка ўспомніў, што яшчэ з учарашняга дня у адным кошыку павінен быў быць вывадак. Яму захацелася паглядзець на галубкоў, сагрэць іх сваім дыханнем. Так ён робіць заўсёды. Хлопчык узлез на перакладзіне ў самы вільчык і пачаў глядзець кошыкі з гнёздамі. У разбуранай страсе віднеўся кавалак неба, адтуль падаў густы сонечны прамень. Галубка зляцела з гнязда і села на вільчык у месцы пралому.

— Волечка мая, — шаптаў Міколка.

Галубы слухалі хлопчыка. Ён часта карміў іх, і зараз галубка зляцела з кругоў і апусцілася на край кошыка. Хлопчык прыгалубіў птушанят і палажыў у гняздо. Потым перелез у пралом страхі і пачаў агладаць вуліцу. Каля паповага дома, на другім канцы вёскі іграла музыка. Згрудзіўшыся стаялі салдаты. Воддалі дыміла паходная кухня; жаўнеры абедалі.

«Адпачываюць, — падумаў Міколка... — Як-жа паведаміць?» Было ўжо блізка к абеду. Галубы ляцелі на вадапой. І тут прышла думка.

Некалі маці варыла вялікодныя яйкі. Тады-ж, у цыбульнай шалусе, афарбавала яго кашулю. Ён так і забыўся-б пра яе, калі-б яна зараз не вісела пад страхой. Міколка хуценька саскочыў з вільчыка на перакладзіну, дастаў кашулю, парваў яе на доўгія істужкі і накіраваўся да галубоў. Птушкі ведалі свайго гаспадара, буйна вуркавалі ў яго над вухам.

— Галубо-о-к мой, цівачка, — гаварыў ён галубам. Потым, злаўчыўшыся, схапіў двух галубоў і палез на вільчык. Там ён схаваў аднаго голуба за пазуху, а другому прывязаў да нагі чырвоную істужку. Потым тое самае зрабіў з першым. Істужкі — доўгія, шырокія — звісаюць ад ног аж да перакладзіны. Міколка падкінуў галубоў высока ў неба. Яны ўзвіліся, пакружылі над вільчыкам, матляючы ў паветры істужкамі, і паляцелі ў бок лесу... Нібы Міколка прасіў іх, каб яны ляцелі туды. Ах, якое шчасце!..

Жаўнеры заўважылі галубоў, стралілі, але толькі больш напалохалі птушак. Камандзір загадаў знайсці двор, адкуль зляцелі галубы, і спаліць яго. Міколка не бачыў, як падышоў чалавек і пхнуў у страху палаючую жменю саломы. Ён адчуў едкі дым, які цягнуў ад Ганчынай хаты.

— Няўжо пажар? Ой, хата гарыць!— скеміў хлопчык і быў памкнуўся злазіць, ды перадумаў і пачаў вымаць з кошыкаў маленькіх птушанят... Ён рабіў гэта, не адчуваючы ніякага страху. А страх быў тут-жа, побач... Вусаты афіцэр сачыў за рухамі Міколкі.

— А ну, злазь, псякрэў.—крыкнуў ён.

Міколка здрыгануўся, знянацку ледзь не зваліўся.

— Што ты робіш?.. А ну, хадзі сюды...

Афіцэр узяў Міколку за вушы так, што пачуўся трэск.

— Ай, — крыкнуў хлопчык, — ай...

— Маўчы, ідзі ўперад...

Міколка пайшоў з пуні на вуліцу. Афіцэр, выняўшы наган, павёў Міколку ў папоўскі дом.

Раптам у вёсцы пачулася страляніна. Аднекуль прагучалі крыкі «ура». Стогалосым рэхам задрыжалі шыбы. А хата Ганкі займалася полымем. Густы дым ішоў па ветру ў бок гарода.

— Ура-а-а! — дрыжала паветра ад пераможных воклічаў.

— Што гэта? — пытаўся ў спалоху афіцэр.

Па вуліцы беглі палякі. Трапная куля падстрэліла афіцэра і ён, убачыўшы сваё бяссілле, ірвануўся бегчы.

— Назад! — крыкнуў хтосьці афіцэру... Гэта быў Ганчын бацька. Прагучаў стрэл і афіцэр упаў.

— Што ў цябе за пазухай? — спытаўся Ганчын бацька ў Міколкі.

— Галубы... Пан хацеў страляць у мяне.

— У цябе?!. Ах, сволачы! А хату падпалілі.

— Ой! — крыкнуў Міколка...—Там Ганка...

Ганчын бацька пабег на двор і праз мінуту выскачыў з дачкой. А яшчэ праз колькі часу ён вынес з полымя і сваю старую... Старая была мёртвай.

Міколка трымаў галубоў і не ведаў, куды ісці. Перастрэлка не змаўкала. З аднаго канца вёскі надаспелі чырвоныя, а з другога—партызаны. Палякі адступалі.

— Ну, што-ж, прапалі твае галубы?— спытаўся бацька, убачыўшы Міколку жывога.

— Не прапалі, вось яны, — выняў ён птушанят з-за пазухі. Вецер ішоў старанай і пажар ахапіў толькі дзве хаты: Міколкі і Ганкі. Людзі не пусцілі агонь далей. Гледзячы на пажар, Міколка сказаў:

— Усё-ж, шкада старой Ганчынай маці... І галубоў шкада... Ах, як шкада..

Мазалава, Мсціслаўскага раёна.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Т—2017.